№ 33 (678) 1 верасня 2010

www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

П Е Р Ш А Я   Б Е Л А Р У С К А Я   Г А З Е Т А

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



**Чаму Лукашэнка крычыць на Сідорскага?**

Старонка 3



**Школа для Колі: рэпартаж**

Старонка 5



**Ісландыя купляе ў Беларусі Су-27 для НАТО**

Старонка 2


### У НУМАРЫ

**Уладзімір Барадач: Гэтая ўлада разумее толькі сілу**

Палкоўнік спецназа гатовы застацца ў эміграцыі. **Старонка 3.**

**Лахтэйн: не даў рады спакусам ці падставілі спецслужбы?**

Фотаздымкі «20-гадовай мінчанкі» зроблены ў фоташопе. **Старонка 8.**

**«У гасцях у кандыдата»: Віталь Рымашэўскі**

Чарговай ахвярай супольнага праекта фатографа «Нашай Нівы» Юліі Дарашкевіч і карэспандэнта «Салідарнасці» Анастасіі Зелянковай «У гасцях у кандыдата» стаў прэтэндэнт ад хадэкаў. **Старонка 12**

**«Каласы пад сярпом тваім» здымуць па-беларуску**

Толькі хто і калі? **Старонка 11**

**Кубак СНД і галандцы**

БАТЭ трэці год запар трапіў у групавы этап футбольных еўракубкаў. **Старонка 15.**


«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2.**

# Хто замаўляў кактэйлі?

На дзень нараджэнння Лукашэнкі ў дыпламатычнае прадстаўніцтва Расіі ў Мінску кінулі дзве бутэлькі з запальнай сумессю.

Паводле звестак МНС Беларусі, інцыдэнт адбыўся 30 жніўня каля 22.50. Праз жалезны плот на тэрыторыю амбасады невядомыя кінулі бутэлькі з «кактэйлем Молатава». Адна з іх трапіла ў задняе шкло пасольскага аўтамабіля «Мазда-3», пабіла яго і ў салоне загарэлася. Дыпламаты, не чакаючы пажарных, згасілі агонь самастойна.

Паводле інцыдэнту распачатая крымінальная справа па арт. 339 КК РБ (хуліганства). Рэшткі гаручай вадкасці забраныя для экспертызы. Высвятляюцца асобы людзей, якія кінулі бутэлькі. Мяркуецца, што іх было двое.

Як любое пасольства, прадстаўніцтва Расіі надзейна ахоўваецца. Каля яго дзейнічае сталы пост міліцыі. Перыметр амбасады праглядаецца відэакамерамі назірання.

Паводле словаў начальніка аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Аляксандра Ластоўскага, «кактэйль» быў наліты ў кактэйльныя ж ёмістасці.

На месцы злачынства знойдзеная бутэлька 0,33 літра з рэшткамі запальнай сумесі, а таксама аскепкі яшчэ адной такой жа, з рэшткамі кнота – у такіх бутэлечках прадаюць слабаалкагольныя кактэйлі. Яе працей схаваць у кішэню і прынесці бліжэй да амбасады. Хоць танк такой колькасцю яўна не запаліш: гэта хутчэй «пробнік».

**Алесь Пілецкі**



PHOTO.BYMEDIA.NET

## МЗС Расіі: «Імкненне пэўных сілаў» — МЗС Беларусі: «Хуліганская выхадка»

Афіцыйная рэакцыя на інцыдэнт не прымусіла сябе чакаць.

«Расцэньваем дадзенае здарэнне як абуральны акт, за якім праглядаецца імкненне пэўных сілаў паспрабаваць перашкодзіць нармальнай працы амбасады і прыўнесці ў двухбаковыя адносіны элементы недаверу і напружанасці», — гаворыцца ў заяве МЗС РФ. З якога боку тыя сілы – не ўдакладняецца.

Расійскае МЗС накіравала Беларусі ноту пратэсту, у якой запатрабавала расследавання інцыдэнту. У выніку здарэння маскоўская міліцыя ўзмацніла меры бяспекі ў раёне размяшчэння амбасады Беларусі.

Беларускае міністэрства замежных спраў, у сваю чаргу, заявіла, што «мы з заклапочанасцю і абурэннем успрынялі інфармацыю аб здарэнні каля пасольства Расійскай Федэрацыі. Гэтая злачынная хуліганская выхадка скіравана супраць цвярозага розуму і беларуска-расійскіх адносінаў».

• **На расійскую амбасаду ў Мінску нападалі тройчы.** Усе інцыдэнты адбываліся ў ноч на першы або апошні дзень месяца...

• **Што такое «кактэйль Молатава»?** Гісторыкі дагэтуль не вызначыліся, хто першы выкарыстаў бутэльку з запальнай сумессю...

Працяг тэмы — **старонка 8.**

# Энерганезалежнасць Беларусі каштуе $46 мільярдаў

Урад зацвердзіў амбітную Стратэгію развіцця энергетычнага патэнцыялу на 2011—2020 гады. Яна цалкам паўтарае напрацоўкі апазіцыі — ва ўсім, акрамя АЭС.

9 жніўня Савет міністраў прыняў доўгатэрміновую праграму здабыцця энергетычнай незалежнасці ад Расіі. Менавіта так можна трактаваць сутнасць Стратэгіі развіцця энергетычнага патэнцыялу Беларусі на 2011—2020 гады. Праект, які не можа не спадабацца Міжнароднаму валютнаму фонду і заходнім інвестарам, прадугледжвае выкарыстанне энергіі з альтэрнатыўных крыніц, дыверсіфікацыю паставак паліва і, вядома ж, маштабную прыватызацыю. У ім няма ніводнага намёку на «ўнутрырасійскія цэны», якіх Беларусь дабівалася больш за дзесяць гадоў. Беларусь пойдзе сваім шляхам, дэкларуе ўрад.

### Аплацяць усёй Еўропай

Агульны кошт праекта ўражвае – $46 мільярдаў! Унутры краіны такіх сродкаў не акумулюеш. «Для фінансавання інвестыцыйных аб'ектаў будуць прыцягнутыя крэдытныя рэсурсы банкаў Аўстрыі, Францыі, Чэхіі і Кітая», — прызнае праграма. Рэшту ўкладуць інвестары і даплаціць дзяржаўны бюджэт.

Галоўныя мэты праграмы – знізіць энергаёмістасць ВУП на 60% у параўнанні з 2005 годам, павялічыць долю ўласных энергарэсурсаў з 20% да 33%, зменшыць долю газу ў спажыванні краіны з 72% да 55%. Урэшце, зменшыць долю дамінуючага пастаўшчыка энергарэсурсаў (чытай – Расіі) з 82% да 57%.

Ніякіх сенсацыйных праектаў урад не прапанаваў. Пацверджаны намер будаваць сумесны тэрмінал для прыёму звадкаванага газу на тэрыторыі Літвы або Польшчы. Яшчэ раз пералічаныя «нафтавыя сябры» Беларусі (Іран і Венесуэла) і дзяржавы, якія дапамогуць з транзітам паліва, – Украіна і тры балтыйскія краіны. Дарэчы, як выявілася, Літва выставіла канкрэтную ўмову – клайпедскі порт гатовы сёлета заняцца пастаяннай перакачкай венесуэльскай нафты толькі калі Беларусь гарантуе доўгатэрміновую загрузку тэрмінала на пяць гадоў.

Атрымліваць энергію Беларусь гатова з усяго – ад сонца да адкідаў сельскай гаспадаркі, хоць «рашэнне аб мэтазгоднасці іх спальвання варта прымаць у індывідуальным парадку». Напрыклад, да 2015 года пачнецца асваенне беларускіх радовішчаў бурага вугалю, вырашана звярнуцца і да гаручых сланцаў.

**Працяг на старонцы 4.**

# Ісландыя купляе ў Беларусі Су-27 для трэніровак НАТО

### Агульная сума кантракта складзе $1,5 млрд.

Ісландская авіябаза Кефлавік, былы апорны пункт НАТО ў перыяд халоднай вайны, рыхтуецца прыняць дзве эскадрыллі расійскіх Су-27, піша «Financial Times».

Урад Ісландыі вядзе перамовы аб здачы базы ў арэнду прыватнай кампаніі, якая плануе ператварыць яе ў трэніровачны цэнтр для замежных ВПС. Для гэтага, як заяўляюць прадстаўнікі кампаніі, у Беларусі будуць закупленыя расійскія знішчальнікі на агульную суму $1,5 млрд.

Пастаўшчыком павінен выступіць «Белтэхэкспарт». Першая пастаўка чакаецца ўжо ў кастрычніку.



Дэманстрацыйны палёт Су-27 над Баранавічамі.

Як паведамляе «Файнэншыял таймс», кампанія ўжо падпісала кантракты на правядзенне лётных трэніровак з выкарыстаннем расійскіх самалётаў з ВПС пяці дзяржаваў. Якіх — не ўдакладняецца.

Таксама гаворыцца, што на дадзены момант ужо падпісаны кантракт аб набыцці 15 самалётаў і разглядаецца магчымасць закупкі яшчэ 18 машын.

Паводле інфармацыі, прадстаўленай урадавай крыніцай, ісландскі ўрад ухваляе гэтую ініцыятыву прыватнай кампаніі і сур'ёзна гатовы разгледзець магчымасць яе акрэдытацыі. Аднак, як заяўляе крыніца, Ісландыя пракансультуецца з партнёрамі па НАТО, перш чым прыме канчатковае рашэнне.

Тым не менш, «Белтэхэкспарт» адмаўляе заключэнне пагаднення з ісландскай кампаніяй, хоць, як піша газета, раней паведамляў адваротнае.

«Расабаронэкспарт» заяўляе, што не мае да гэтай угоды ніякага дачынення.

**КаМ**

## Сцісла

**• Лукашэнка параўнаў міліцыю з купкай бандытаў.** Аб гэтым ён заявіў 30 жніўня на нарадзе па пытанні аб сутэнёрстве ў Прыпяцкім нацпарку. «Да міліцыі шмат пытанняў. Яны часам забываюць аб тым, што яны народная міліцыя, а не паліцыя і не купка бандытаў», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Ён падкрэсліў, што скарга, якая паступіла ад работнікаў Нацпарку, патрабавала разгляду на найвышэйшым узроўні.

**• Перамовы аб адзінай валюце з Беларуссю зайшлі ў тупік.** Гэта прызнаў расейскі прэм'ер Уладзімір Пуцін. Ён адзначыў, што рашэнне гэтага пытання заблакаваў Мінск.

**• Арыштаваны банкаўскі рахунак пратэстанцкай царквы «Новае жыццё».** На мінскую царкву наклалі непамерны штраф. Вернікі адмаўляюцца плаціць яго. Рахунак быў у «Белінвестбанку».

**• Анатоль Сідарэвіч выйшаў з Грамады.** Палітык распаўсюдзіў адпаведную заяву праз электронную пошту. Гісторык і логік Сідарэвіч быў адным з ідэолагаў аднаўлення сацыял-дэмакратычнай партыі і ўдзельнічаў у яе дзейнасці нязменна пры розных лідарах. У сваім лісце ён просіць не звяртацца да яго па каментары матываў свайго учынку.

**• Святкаванне Дня горада ў Мінску 11—12 верасня пройдзе на шасці дзясятках пляцовак.** Свята пачнецца 10 верасня ў Музычным тэатры цырымоніяй «Найлепшы па прафесіі» па выніках конкурсу «Мінскі майстар». Выстава-кірмаш тавараў пройдзе ў суботу і нядзелю каля Нацыянальнай бібліятэкі. Там жа адбудзецца канцэрт «Мой родны Мінск — мой лёс, мая надзея!», які завершыцца выступленнем аркестра Фінберга. У Верхнім горадзе каля Ратушы пройдзе фэст «Мінск тэатральны» — урыўкі са спектакляў пакажуць артысты. На вуліцы Рэвалюцыйная будзе свята «Мінскі дворык», у праграме якога — канцэрт, фотавыстава, выстава карцінаў маладых мастакоў і студэнтаў. У «Мінск-Арэне» адбудуцца міжнародныя спаборніцтвы па муай тай за тытул чэмпіёна свету. А каля Палаца спорту 11 верасня пройдзе турнір асілкаў. Мінчане змогуць пакатацца на роліках, каньках, а таксама пагуляць у кёрлінг. Кульмінацыяй святочнага дня стане феерверк.

**МБ**

# Журналіст Падаляк абвяргае сувязі з КДБ

### «Вы доўга шукалі мае «сур'ёзныя кантакты» ў Маскве, але хто ж вам намалюе рэальную карціну?»

31 жніўня на сайце газеты «Свободные новости плюс» з'явілася цынічнае інтэрв'ю Міхаіла Падаляка. Дэпартаваны з Беларусі журналіст, які жыве ў Кіеве, прызнаваўся ў сувязях з КДБ і расійскімі спецслужбамі ды з задавальненнем казаў пра сваю сённяшнюю дзейнасць — чорны піяр.

Цягам дня інтэрв'ю працытавалі навінныя інтэрнэт-сайты. Увечары Падаляк заявіў, што не гутарыў з карэспандэнтам «СН-плюс». Адмовілі гэта і рэдактар газеты Васіль Зданюк, і палітычны аналітык Валер Карбалевіч, чыім імем падпісаная гутарка. Паводле словаў В.Зданюка, матэрыял з'явіўся пасля таго, як сайт газеты быў узламаны. Пасля sn-plus.com не працаваў.

У разлеглым абвяржэнні, якое змясціў сайт «Народнай волі», Падаляк не адмаўляе, што кантактаваў са спецслужбамі: «Запраста мог трапіць на любы ўзровень доступу да інфармацыі». Не адмаўляе, што атрымлівае задавальненне ад «камраметуючай журналістыкі»: «Канструяванне інфармацыі — бізнэс. Добры бізнэс».

Дык нашто было падрабляць цэлае інтэрв'ю? Паводле словаў Падаляка, да яго ў Кіеў час ад часу прыязджаюць высокапастаўленыя спецслужбісты і прапануюць «сысці з тэмы». У абвяржэнні называюцца імёны намесніка старшыні КДБ Беларусі Леаніда Дзядкова і начальніка ГУ контрвыведкі КДБ Сяргея Шугаева. «Вы так і не зразумелі, з кім з «генералаў» (як вы іх называеце) можна дамовіцца, каб я «сышоў з тэмы»? А вы ж доўга шукалі мае «сур'ёзныя кантакты» ў Маскве, але хто ж вам намалюе рэальную карціну?» — рытарычна выгукае Падаляк. Ці гэта праўда, ці таксама «канструяванне інфармацыі» — няма як праверыць. Застаецца і пытанне qui prodest.



PHOTO.BYMEDIA.NET

У Беларусі з Падаляком у розны час супрацоўнічалі «Белгазета», «Навіны», пасля — газеты Аб'яднанай грамадзянскай партыі. Артыкул Падаляка з паклёпам на лідэра Руху «За Свабоду» Аляксандра Мілінкевіча апублікавала на першай паласе «Народная воля».

Падаляк засвяціўся ў трэцім фільме «Хросны бацька» тэлеканала НТВ як крытык Аляксандра Лукашэнкі.

**Мікола Бугай**

# Дрэвы для Дажынак купляюць ў Польшчы

### Раней польскімі дрэвамі засадзілі Савецкую плошчу ў Гродне.

Са словаў супрацоўніцы гродзенскага «Зелянбуда» Ніны Нянахавай, дрэвы яны замаўляюць у Польшчы больш для разнастайнасці, для экзотыкі: «У нашых умовах дэкаратыўныя пароды дрэваў (шурпаты вяз і чырвоны клён) вырасціць складана».

Дрэвы да нас прывозяць ужо гатовымі да высадкі, у спецыяльных кадушках. Ім каля дзесяці гадоў.

Што тычыцца тэрмінаў, то азеляніць галоўную плошчу свята гродзенскі «Зелянбуд» паспее ў час.

**Ганна Навумовіч, Гродна**

### Самае чытанае на nn.by за 25—31 жніўня

- «Школу для Колі» перабудоўваюць другі год запар
- Правакацыя? Расійскае пасольства ў Мінску закідалі кактэйлямі Молатава
- Сідорскі вызначыўся
- Сачыце за камерай
- Пуцін: Я не глядзеў «Хроснага бацьку», але мне распавядалі
- Калі жанчына не адмовіцца ад сэксу
- Малочка: «З кожнай фуры на хабар ішло да сямі тысяч даляраў»
- Самыя бязглуздыя спосабы кантрацэпцыі
- Лукашэнка пра фільмы на НТВ: «Я на гэты бруд адказваць не збіраюся»
- Поўнае відэа інтэрв'ю Аляксандра Казуліна каналу НТВ

## nn@nn.by

### Абрыдла

Упэўнена, што бліжэй да выбараў Мінздароўя заявіць не пра зніжэнне смяротнасці ў гэтай дабраславёнай краіне, а пра спыненне яе. І служкі культу будуць сцвярджаць, не міргнуўшы вокам, што адпяванняў не было. А былі толькі хрэсьбіны і вянчанні. А-брыд-ла! І пра чыстыя вуліцы, і пра самых прыгожых жанчын, і пра глузды беларусаў, што больш важаць, чым у іншых былых абарыгенаў СССР.

І лядовыя палацы на кожным рагу... пустыя. Была я сёння там. Тры чалавекі абслугі. І ўсё! Пачнецца новы навучальны год – нагоняць прыгонных настаўнікаў з кучай беларускіх геніяў са школ, дзе ў 11 класе «геній» сцвярджае, што «азон знаходзіцца ў цвёрдым стане глыбока ў зямлі». І чытае «па-англійску»: «Шакеспеаре із эверу в хере кноун» (Shakespeare is everywhere known). Што ж, так нам і трэба!

**Таццяна Карэліна, Мінск**


# Не ўсё ў жыцці апошні раз!

## Падпіска праз Рэдакцыю

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 7500 рублёў.

Мы рэкамендуем падпісвацца праз Рэдакцыю.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Каб штотыдзень атрымліваць газету, дасылайце адрасы і грошы за газету.

1) Просім усіх ахвотных падпісацца паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз: тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перакazu дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езда.

**Банкаўскія рэквізіты (змяніліся з 1 мая):**

ПВУП «Суродзічы», УНП 190 786 828

Адрз. № 539 ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Мінск, код 739

Рахунак атрымальніка: 3012 740 628 011

Від аплаты: За газету «Наша Ніва»

## Падпіска праз «Белпошту»

Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252. Падпісацца можна на кожнай пошце.

## Дзякуй падпісчыкам,

якія падпісваюцца праз Рэдакцыю

Сяргею Х. са Столінскага раёна.
Ларысе Р. з Калінкавіцкага раёна.
Р.Д., Анатолю П. з Салігорскага раёна.
М.Б., Дзмітрыю П., В.Ф. з Гомеля.
Вікенцію С. з Валожынскага раёна.
А.Г. з Бабруйскага раёна.
А.Б., Г.Ю. з Верхнядзвінскага раёна.
Алесю Б., В.Г. з Баранавіцкага раёна.
Барысу С., Н.К. са Светлагорскага раёна.

# Чаму Лукашэнка крычыць на Сідорскага?

На нарадзе па эканамічнай сітуацыі Аляксандр Лукашэнка зноў рэзка крытыкаваў прэм'ера.

«Вы голы эканаміст, а не палітык. Палітык тут я», — як школьніка адчытаў кіраўнік дзяржавы другую асобу ў краіне. Прэм'ер стаяў, апусціўшы галаву.

Гэта здарылася пасля таго, як Сідорскі папрасіў адтэрмінаваць пагашэнне крэдытаў для заводаў МАЗ, БелАЗ, «Белкард», БАТЭ, МТЗ і «Аўтагідраўзмацняльнік». Маўляў, яны ўжо пачалі добра прадаваць сваю прадукцыю.

«Ну дык хай вяртаюць, калі сталі прадаваць. Я палітык, я павінен думаць пра людзей, а вы павінны думаць пра эканоміку і фінансы. У вас няма людзей. Забудзьцеся! У эканоміцы людзі не стаяць за грашыма і трактарамі. Вы голы эканаміст. Вы павінны прыходзіць з міністрам фінансаў да мяне і змагацца за кожны рубель, за кожную капейку. І гэта я вам павінен гаварыць, што там за імі стаяць людзі. У мяне такое ўражанне, што ўрад, які сёння ўносіць прапановы, не думае працаваць з 1 студзеня...»

Гэтыя кадры, дзе кіраўнік дзяржавы павучае прэм'ер-міністра, былі шырока паказаныя на дзяржаўных тэлеканалах. Нельга пабачыць, каб Лукашэнка крычаў на Пракаповіча ці Макея, а вось на Сідорскага падымае голас увесь час, нібыта спрабуе яго прынізіць. Сам Сідорскі рэдка адважваецца нешта запярэчыць, толькі стаіць схіліўшыся.

У выпадку нейкай няўдачы ён зможа павесіць усіх сабак на прэм'ера.

Дзеля чаго гэта робіць Лукашэнка? Якіх мэтаў ён спрабуе дасягнуць, калі робіць публічную лупцоўку для кіраўніка ўрада?

Паліттэхнолаг Аляксандр Фядута перакананы, што такім чынам лідар дзяржавы змагаецца з уласнымі комплексамі і фобіямі. «Лукашэнка баіцца Сідорскага. Ён так сябе паводзіць з тымі людзьмі, якіх лічыць небяспечнымі для сябе. Гэта спроба пераадолець уласныя жахі. Пакуль ты цалкам не знішчыш, не прынізіш чалавека, якога баішся, то гэты страх будзе цябе пераследаваць», — мяркуе А.Фядута.


АНТОН МАТОЛЬКА

Маскоўскі журналіст Павел Шарамет думае, што такім чынам беларускі лідар можа рэагаваць на чуткі пра ўдзел Сідорскага ў прэзідэнцкіх выбарах.

«Гэта тыповыя паводзіны Лукашэнкі ў дачыненні да людзей. Ён не цэрпіць любую фігуру побач з сабой, якая хоць нешта з сябе ўяўляе. Таксама да яго даходзяць гэтыя дурныя чуткі, што Сідорскі можа стаць апазіцыйным кандыдатам на выбарах, чалавекам Крамля. Сідорскі ні ў якім разе не будзе ўдзельнічаць у выбарах. А такія чуткі — гэта трызненне і луха. Іх распускаюць самі ж беларускія спецслужбы, —кажа П.Шарамет і дадае: — Для Лукашэнкі нармальна высмейваць людзей, прыніжаць іх».

Першы прэм'ер-міністр пры Лукашэнку Міхаіл Чыгір нагадвае: «Гэтая адмоўная рыса характару тычылася не толькі Сідорскага. Яна зачапіла амаль усіх. Са мной ён таксама спрабаваў размаўляць у такім тоне».

Філосаф Алесь Анціпенка бачыць у Сідорскім добрага прафесіянала. «Ён адна з ключавых асобаў у дзяржаве. Эліты ўсведамляюць яго як добрага прафесіянала. А гэта, магчыма, робіць Сідорскага ў вачах Лукашэнкі канкурэнтам. Некаторыя ж і апазіцыйныя палітыкі гатовыя яго падтрымаць. Акрамя таго, такім чынам Лукашэнка рыхтуе вінаватых у эканамічных праблемах. У выпадку нейкай няўдачы ён зможа павесіць усіх сабак на прэм'ера», — лічыць А.Анціпенка.

**Зміцер Панкавец**

Сідорскі вызначыўся — каментуе Андрэй Дынько. **Старонка 7.**

# Уладзімір Барадач: Гэтая ўлада разумее толькі сілу

Палкоўнік спецназа і крытык Лукашэнкі гатовы застацца ў эміграцыі.

У сярэдзіне 1990-х палкоўнік Уладзімір Барадач быў легендарнай асобай. Былы кіраўнік мар'інагорскага спецназа ўдзельнічаў у ваенным канфлікце ў Арменіі. Ён быў адным са стваральнікаў Беларускага згуртавання вайскоўцаў. У 1996-м Барадач выступіў на баку Канстытуцыі, супраць Лукашэнкі.

Не так даўно палкоўнік стаў героем перадачы НТВ «Хросны бацька», дзе крайне рэзка выказаўся аб дзейным кіраўніку дзяржавы. Тры тыдні ад моманту паказу фільма Барадач знаходзіўся за межамі краіны. Цяпер ён думае, ці варта вяртацца ўвогуле.

**«Наша Ніва»: Сапраўды, збіраецеся застацца ў Германіі?**

**Уладзімір Барадач:** Думаю над гэтым. Такая сітуацыя ў мяне склалася, альбо садзіцца ў турму, альбо заставацца тут. За час адсутнасці ў Беларусі на маёй кватэры прайшоў несанкцыянаваныператрус. Нешта шукалі. Думаю, што любыя дакументы, якія датычаць Саюза афіцэраў. Ён усё ж існуе. Ёсць група маіх таварышаў, якія не адмовіцца ад сваіх перакананняў. Ёсць неабходная колькасць людзей, якія ў пэўных абставінах маглі б паўплываць на рашэнне тых ці іншых падзей. Цяпер самых актыўных з нас спрабуюць ізаляваць ад удзелу ў выбарах і найперш паслявыбарчых падзеяў. Бо выбараў няма. Адзіны метад барацьбы ў сённяшніх умовах — сілавы ціск. Іншыя метады на рэжым не паўплываюць.

**«НН»: Але ж Вы не з пужлівых людзей.**

**УБ:** Для мяне гэта складанае маральнае пытанне. Што я змагу зрабіць за два-тры гады, праведзеныя ў турме? Мне здаецца, што больш карысці для айчыны і шкоды для рэжыму я магу прынесці на свабодзе. Важнае пытанне: з кім ісці на выбары? Без падтрымкі, без фінансавання нават група сур'ёзных людзей не зможа займець абмундзіравання, экіпіроўкі, падрыхтаваць людзей. Хто дапаможа? Захад, Расія? Ужо перапоўнена чаша страху ўнутры краіны, нават сярод мужных людзей. Без абгрунтаванай сілы з гэтым рэжымам змагацца немагчыма.

Разумею, што застацца на Захадзе — гэта фактычна здацца. У мяне няма страху. Я проста хачу дабіцца нейкага выніку.

**«НН»: А самі не думалі ўдзельнічаць у выбарах?**

**УБ:** Той парад прэзідэнтаў, што ёсць цяпер, ужо раздражняе публіку. Ісці на выбары для мяне было б немаральна. Апазіцыі важна аб'яднацца, каб паказаць усю нелегітымнасць Лукашэнкі, каб з гэтым згадзіліся і Расія, і Захад. Людзі, якія адхіляць Лукашэнку ад улады, будуць героямі.

**«НН»: У вас ёсць спадзяванні на дапамогу Расіі?**

**УБ:** Скінуць гэты рэжым можна толькі з падтрымкай Расіі. Захад хоча правесці перамены больш маральнымі прынцыпамі. Была добрая спроба ўцягнуць Беларусь ва «Усходнiе партнёрства», але гэта вельмі тонкі шлях і не з прэзідэнтам Лукашэнкам. Расія ў дадзенай сітуацыі — асноўны гулец. З Расіяй можна дамовіцца. Нам будзе мала толькі ўласнай рашучасці, трэба дапамога і звонку.

**«НН»: Думаеце, Вам помсцяць за ўдзел у «Хросным бацьку»?**

**УБ:** Там была паказаная толькі маленькая частка з запісанага, зусім неістотная. Больш сур'ёзныя рэчы, магчыма, пакажуць у наступных частках, а можа ўвогуле не пакажуць. Дарэчы, нядаўна ад майго імя сфальсіфікавалі зварот, дзе нас фактычна зрабілі саюзнікамі Лукашэнкі. Наш зварот быў вельмі рэзкі. Ні пра якое супрацоўніцтва з рэжымам гаворка не ішла.


CHARTER97.ORG

**Уладзімір Барадач**

нар. у 1951 годзе ў вёсцы Нача (Крупскі раён). Скончыў мінскую Сувораўскую і разанскую Дэсантную (факультэт «Спецназ») вучэльні. У 1981—1983 ваяваў у Афганістане. Камандаваў Мар'інагорскай брыгадай спецназа. Звольніўся ў запас у 1993. Вядомасць атрымаў у 1996 падчас процістаяння Лукашэнкі з Вярхоўным Саветам. У Барадачу бачылі магчымыга кіраўніка вайсковага перавароту.

**Гутарыў ЗП**

## Мілінкевіч не будзе ўдзельнічаць у выбарах?

Паводле інфармацыі «НН», лідар Руху «За Свабоду» можа абвесціць пра адмову бліжэйшымі днямі.

Сам Мілінкевіч гаварыць на гэтую тэму не захацеў: «Калі будзе такая заява, то вы пра яе даведаецеся».

Аляксандр Мілінкевіч удзельнічаў у прэзідэнцкіх выбарах 2006 года. Па афіцыйных звестках, ён заняў другое месца з больш чым 6% галасоў. Па звестках незалежных сацыёлагаў, ён сапраўды быў другім паводле папулярнасці, але ягоная падтрымка дасягала 18%.

Ад правацэнтрысцкіх сілаў вылучаныя таксама кандыдатуры незалежнага палітыка Алеся Міхалевіча, намесніка старшыні Партыі БНФ Рыгора Кастусёва і сустаршыні Беларускай хрысціянскай дэмакратыі Віталя Рымашэўскага. Асобна вядзе сваю кампанію каардынатар «Еўрапейскай Беларусі» Андрэй Саннікаў.

**ЗП**

## Мартынаў: У Беларусі і Гамбіі шмат супольнага

Такую заяву міністр замежных справаў зрабіў пасля сустрэчы з гамбійскім калегам Мамаду Тангара.

Гамбія — гэта невялікая краіна Заходняй Афрыкі, якая з трох бакоў мяжуе з Сенегалам, а чацвёртым выходзіць на акіян. Была нават ідэя стварэння «саюзнай дзяржавы» Сенегамбія, але праз нейкі час дамовы скасавалі, бо гамбійцы хацелі большай самастойнасці.

З 1994 года краінай кіруе Яг'я Джамэг, які прыйшоў да ўлады ў 28 гадоў. У Джамэга рэпутацыя шамана, ён кажа, што лечыць СНІД і астму мясцовымі травамі.

Размаўляў з гамбійскім калегам і міністр адукацыі Аляксандр Радзькоў. Было прынятае рашэнне, што афрыканскія студэнты паедуць вучыцца да нас, а мы адправім у дапамогу гамбійцам сваіх выкладчыкаў.

**ЗП**

## Сціслa

**• МТС не будзе абмяжоўваць доступ да інтэрнэту з 1 верасня.** Рашэнне кампаніі ўзгоднена з Аператыўна-аналітычным цэнтрам пры прэзідэнце. Пра гэта паведаміў генеральны дырэктар СТАА «Мабільныя ТэлеСістэмы» Уладзімір Карповіч 31 жніўня. Згодна з указам прэзідэнта № 60 аб рэгуляванні нацыянальнага сегмента інтэрнэту, з 1 верасня аператары павінны забяспечыць паслугу блакавання доступу да «непажаданых інтэрнэт-рэсурсаў» «паводле запыту карыстальнікаў». «1 верасня для нашых абанентаў нічога не мяняецца», — падкрэсліў Карповіч. Паводле слоў гендырэктара кампаніі, на гэты момант у МТС няма адпаведнай тэхнічнай базы.

**• Беларусь другі раз адмовілася выдаць Бакіева.** «Мы будзем шукаць для гэтага іншыя шляхі», — паабяцаў генеральны пракурор Кыргызстана Байцымір Ібраеў.

**ЗП; БелаПАН**

# Энерганезалежнасць Беларусі каштуе $46 мільярдаў

Працяг са старонкі 1.

### Адцягнутая прыватызацыя

На працягу пяці гадоў улады плануюць цалкам рэфармаваць энергасістэму. Спачатку будзе створана РУП «Высакавольтныя электрычныя сеткі», якому будуць перададзеныя сеткавыя аб'екты інжынернай інфраструктуры. Гэта адбудзецца ў 2010—2011 гадах. У наступныя два гады будзе створанае РУП «Белгенерацыя», якое аб'яднае найбуйнейшыя электрастанцыі. На завяршальным этапе (у 2014—2015 гадах) адбудзецца раздзяржаўленне і прыватызацыя «Белгенерацыі».

Тарыфы на газ для насельніцтва (які і на цеплавую энергію) узрастуць да ўзроўню 100% пакрыцця стратаў да 2014 года. На электраэнергію яшчэ раней — да 2013 года.

### Клубок ідэй

На жаль, стратэгія не выглядае цэласнай і канкрэтызаванай, хоць тэрміны яе выканання пачынаюцца ўжо праз чатыры месяцы. Ідэалізаваная карцінка светлай будучыні, якая звычайна ўласцівая праграмам. Асноўны пасыл — «Знізіць залежнасць ад Расіі» — не дае зразумелага тлумачэння, хто ж дасць запаветныя $46 мільярдаў.

У цэлым Стратэгія ўрада — копія ранейшых прапановаў апазіцыі. За адным выняткам: апазіцыя супраць пабудовы АЭС. Зрэшты, менавіта гэты пункт стратэгіі будзе найцяжэй рэалізаваць, і праз яго ны кошт, і праз нежаданне Расіі выдаваць пад яго крэдыт.

**Яўген Васількоў**

**Эканаміст Сяргей Чалы: «Праграма нерэальная»**

**«НН»: Рэальна для Беларусі дастаць і выкласці амаль $50 мільярдаў?**

**СЧ:** Вядома ж, немагчыма. Але зразумейце, што гэта ўсяго толькі стратэгія, а не план канкрэтных мерапрыемстваў.

Проста яе сабралі з усяго, што было. А вось выкананне — гэта ўжо зусім іншае пытанне. Напрыклад, прыватызацыя энергасістэмы ўвогуле аднесеная да апошняга этапу, да якога яшчэ дажыць трэба.




# Дзе пройдзе Другая?




### Аказваецца, напалову яна ўжо пабудаваная.

Праектаваная траса вакол Мінска павінна стаць дублёрам цяперашняй кальцавой дарогі, разгрузіць яе і пусціць грузавы транспарт у абыход сталіцы. Мінскія ўлады ўсё больш упэўненыя ў тым, што праект будаўніцтва ўдасца рэалізаваць. Галоўны архітэктар сталіцы Віктар Нікіцін ужо заручыўся падтрымкай кіраўніка дзяржавы і Савета Міністраў. Дарога павінна з'явіцца ў 2013–2015 гадах. У інтэрнэце змешчаная дакладная карта, якая паказвае, каля якіх населеных пунктаў пройдзе траса.

Распрацоўшчыкі карысталіся некалькімі асноўнымі правіламі праектавання па-беларуску. Папершае, дарога павінна выглядаць «эстэтычна». З іншага боку, колькасць сродкаў абмежаваная, таму ніякіх новых мастоў ці пуцеправодаў будавацца не будзе.

Частка трасы ўжо ёсць — гэта траса М1 Брэст—Орша на кавалку ад Фаніпаля да аэрапорта «Мінск-2», траса М2 на кавалку ад аэрапорта да Кургана Славы і дарога Р80 ад Кургана Славы да Пільніцы. Апошнюю чакае рэканструкцыя, але прынцыповых зменаў мясцовым жыхарам гэта не прынясе.

### Найбольш пацерпяць жыхары Лашанаў і Навашына, што за Заслаўем.

Застанецца дарабіць дарогу ад Пільніцы да Фаніпаля. Першым новапабудаваным участкам мусіць стаць кавалак Заслаўе—Фаніпаль. Яго здадуць у 2014 годзе, а пасля возьмуцца за апошні кавалак дарогі, з якімі і чакаюцца найбольшыя праблемы. Хоць праекціроўшчыкі і стараліся абвесці трасу міма населеных пунктаў, зрабіць гэтага не ўдалося.

Ад некаторых вёсак траса будзе закрытая гукаадбівальным экранам. Але ён будзе ўсталёўвацца толькі калі адлегласць ад дарогі да дамоў складзе 100 метраў. Калі хоць на пару метраў больш — вяскоўцам і дачнікам давядзецца слухаць круглясутачны шум з трасы.

Навашына і Лашаны — два пасёлкі пад Заслаўем, якія абмінуць не ўдалося. Іх чакае адсяленне. Напрыклад, у Навашыне траса наўпрост пройдзе праз 64 участкі. Жыхарам гэтым дамоў павінна быць прадастаўлена кампенсацыя, але што атрымаюць іх суседзі, апроч папсаванай экалогіі і шуму? Складаная сітуацыя атрымалася і каля Ракава. Тут дарога пройдзе па мяжы заказніка.

Жыхары пасёлкаў і вёсак прапануюць праекціроўшчыкам альтэрнатыўныя варыянты пракладання дарогі, але дзяржава баіцца падаражання праекта.

**Яўген Васількоў**

# Беларусь хоча здабываць у Гамбіі нафту, якой няма

### Новым сябрам Лукашэнкі стане гамбійскі дыктатар?

Беларусь праяўляе зацікаўленасць у магчымым удзеле ў здабычы нафты на тэрыторыі Гамбіі, заявіў кіраўнік міністэрства замежных спраў Сяргей Мартынаў. З яго ных словаў, акрамя ўдзелу ў асваенні карысных выкапняў, Беларусь таксама прапануе афрыканскай краіне стварэнне зборачных вытворчасцяў беларускай тэхнікі. Ягоны калега, міністр замежных спраў Гамбіі Мамаду Тангара рассыпаўся ў кампліментах беларускаму лідару: «У нашага прэзідэнта вельмі добрае стаўленне да Лукашэнкі. Ён стаў прэзідэнтам у 1994 годзе, як і Лукашэнка», — нагадаў афрыканец. Ён таксама рэкамендаваў Мартынаву менш чытаць тое, што піша пра Гамбію замежная прэса: «Вельмі часта тое, што пішуць у газетах і тое, што ёсць у рэальнасці, не адпавядае адно аднаму».

Дарэчы, прэзідэнт Гамбіі прыйшоў да ўлады шляхам вайсковага перавароту. Ён быў яшчэ маладзейшым за Лукашэнку: было яму 28 гадоў.

Але ці сапраўды ёсць нафта ў Гамбіі – вялікае пытанне. Яна існуе толькі ў гіпотэзах. Пакуль краіна сама імпартуе паліва з Сенегала. Нафта ж існуе толькі на словах мясцовага дыктатара Яя Джамэ. Дакладна вядома, што Гамбія багатая на кварцавы пясок і арахіс, але яны наўрад ці зацікавяць беларускае кіраўніцтва.

**ЯВ**

# Двухэтапны рост цэн на гарэлку

### Спачатку падаражала сама, а пасля яшчэ і павысіліся акцызы.

З 27 жніўня павялічыліся адпускныя цэны на гарэлку. Такую пастанову прыняло Міністэрства эканомікі. Цяпер рознічная цана бутэлькі складае 8240 рублёў. Кошт шклатары вытворца ўсталёўвае сам.

А з 1 верасня ў адпаведнасці з прэзідэнцкім указам павялічацца яшчэ і стаўкі акцызаў на алкаголь. Іх рост складзе 10%. Новыя стаўкі будуць дзейнічаць да канца года.

Гэта значыцца, што ў бліжэйшы час гарэлка падаражае яшчэ. Але на колькі? Па падліках эканаміста Леаніда Злотнікава, акцызы складаюць каля 40% у кошце алкагольнай прадукцыі. Атрымліваецца, што рост цэн складзе яшчэ каля 4%.

**ЯВ**

## Сціслa:

• **Пад Бабруйскам пабудуюць цукровы завод.** Для будаўніцтва мяркуецца задзейнічаць кітайскага інвестара, які зможа прыцягнуць доўгатэрміновы крэдыт. Аб'ём інвестыцый можа скласці да 300 млн еўра. Вытворчасцю цукру ў Беларусі займаюцца ў Гарадзеі, Жабінцы, Слуцку і Скідалі.

• **Беларусь атрымала $400 млн ад даразмяшчэння еўраабліґацый.** Гэтая сума атрыманая ў дадатак да дэбютнага выпуску еўраабліґацый на суму $600 мільёнаў.

• **Літоўская Клайпеда прыняла танкер з нафтай для Беларусі.** 80 тысяч тон нафты будуць пагружаныя ў чыгуначныя цыстэрны і дастаўленыя на наваполацкі нафтаперапрацоўчы завод «Нафтан». Пастаўкі з Венесуэлы пачаліся ў маі і вядуцца пераважна праз порт Адэсы. Апроч таго, адзін танкер прыбыў у эстонскі порт Мууга. Перамовы наконт транзіту нафты вядуцца і з Латвіяй.

• **Тур: Прадпрымальнікам дазволяць наймаць працаўнікоў.** Намеснік міністра эканомікі пацвердзіў, што пасля прыняцця дырэктывы №4 «Аб лібералізацыі эканомікі» ІП-шнікам вернуць права, адабранае ў студзені 2008 года. Апроч таго, будзе ўведзены мараторый на праверку дзейнасці прадпрыемства ў першыя 5 гадоў яго працы.

• **«Мяняем аўтахлам на аўтахлам».** Міністэрства прыроды Беларусі хоча, каб Беларусь далучылася да расійскай праграмы абмену старых аўто на новыя. Калі ідэя будзе рэалізаваная, беларусы змогуць здаць старыя машыны на ўтылізацыю і атрымаць новае аўто са зніжкай. Праўда, купляць можна толькі машыны расійскай вытворчасці.

**ЯВ**

# «Школу для Колі» перабудоўваюць другі год запар

**Карэспандэнт «Нашай Нівы» прыехаў у Астрашыцка–Гарадоцкую школу, каб уладкаваць у элітны клас «свайго маленькага пляменніка Колю».**

Чуткі пра загадкавую Астрашыцка-Гарадоцкую школу пачалі распаўсюджвацца мінулым летам, калі выявілася, што нічым не адметную ўстанову тэрмінова перабудоўваюць і рамантуюць, укладваючы гіганцкія бюджэтныя сродкі. «Школа для Колі!» — вырашылі людзі.

Хоць час ісці вучыцца малодшаму сыну кіраўніка Беларусі тады яшчэ не прыспеў, выпадковасці быць не магло, бо менавіта ў Астрашыцкім Гарадку знаходзіцца любімая рэзідэнцыя Лукашэнкі. Год таму школу ўрачыста адкрывалі кіраўнік Рады бяспекі Юрый Жадобін і абласны начальнік Леанід Крупец, а дырэктарка ўстановы ўласнаручна выганяла з будоўлі журналістаў недзяржаўных СМІ...

На рэканструкцыю патрацілі $3 мільёны, але пяцігадовы Коля ў школу не пайшоў, а застаўся з татам. Пытанне пра пачатак яго навучання адклалася на год. Гавораць аб трох варыянтах. Першы — Міколка ідзе ў элітную гімназію на вуліцы Лесі Украінкі, што непадалёк ад Драздоў. Другі — у школу ў Астрашыцкім гарадку, трэці — у школу ў Бараўлянах, якую Лукашэнка мае адкрыць 1 верасня. Нарэшце, апошняя версія — дзіця застаецца на хатнім навучанні.

Карэспандэнт «Нашай Нівы» накіраваўся ў Астрашыцкі Гарадок, каб даведацца, ці гатовыя вяскоўцы да прыезду зорнага дзіцяці, і пагутарыць з дырэктаркай школы Кацярынай Махахей. Праўда, ведаючы яе нелюбоў да недзяржаўных СМІ, прыйшлося пайсці на хітрык.

Замест журналіста незалежнай газеты педагог атрымала ў суразмоўцы проста цікаўнага чалавека, які, па легендзе, спрабуе ўладкаваць свайго пляменніка Колю ў Астрашыцка-Гарадоцкую школу.

## Рай у асобна ўзятай вёсцы

Ад Мінска да аграгарадка Астрашыцкі Гарадок ехаць кіламетраў дзесяць. Спачатку 7 км ад МКАД па Лагойскай трасе, а пасля яшчэ парачку непасрэдна да аграгарадка.

Калі машыны ДАІ пачнуць з'яўляцца часцей і часцей — значыцца, вы на правільным шляху. На коле на ўездзе ў гарадок стаялі два патрулі разам. Усяго ж за шлях туды і назад нам сустрэліся сем аўтамабіляў Дзяржаўтаінспекцыі.

Хоць трохпавярховы будынак школы бачны здалёк, знайсці праезд да яго не надта проста. «Я не ведаю, я ў гэтай школе не вучыўся. Я тут толькі па гастраномах спецыяліст», — даверліва паведаміў мясцовы жыхар, трымаючы пад пахай бутэльку пладова-ягаднага віна. Як пад'ехаць да школы, не змагла патлумачыць і дзяўчына, што калісьці вучылася тут. Астрашыцкі Гарадок не стварае ўражання нейкай адметнай вёскі. Адзінае, што платы паўсюль пафарбаваныя, ды дзе-нідзе сустракаюцца арыгінальныя дамы мясцовых пабагацелых жыхароў. Але хіба не сустрэнеш такое ў іншых вёсках?



**Басейн павінен адкрыцца ў красавіку.**

Заасфальтаваныя толькі некалькі цэнтральных вуліц. Відаць, тыя, па якіх праязджае прэзідэнцкі картэж.

Астатнія — у такіх ямах, што становіцца страшна за сваю машыну. Але нічога, мясцовыя жыхары катаюцца.

Сельсавет сімвалічна размяшчаецца каля школы. Маленькі аднапавярховы адміністрацыйны будынак супраць велічнай навучальнай установы — хто мацнейшы? Вядома ж, школа. А сельсавет выглядае як часовая прыбудова.

Каля заезду на яе тэрыторыю стаяць аўтобусы прывезеных рабочых. Праца кіпіць і звонку, і ўнутры, хоць капітальны рамонт, нагадаем, скончыўся год таму. Бесперашкодна пранікаем унутр будынка, адказваем на завучанае пытанне вахцёркі і, блукаючы па калідорах школы, шукаем кабінет дырэктара.

У школе тым часам сканчаюцца малярныя працы. Насупраць настаўніцкай дзве жанчыны для чагосьці перафарбоўвалі аранжавыя сцены ў жоўтыя.

У чым прынцыповае адрозненне колераў — незразумела нават ім. У дадатак выявілася, што праз адзін слой новай фарбы прасвечваў стары колер. «Давай другім слоем. Усё адно фарбы хоць заліся!» — раіліся жанчыны.

## Цэнтр прыцягнення бацькоў

Дырэктарка Кацярына Махахей з гатоўнасцю адклала свае справы, каб распавесці пра ўмовы навучання ў школе. Кабінет у дырэктаркі даволі прасторны, абстаўлены новай мэбляй, з вялікім партрэтам Лукашэнкі на сцяне. На стале — мясцовая газета і «Веснік адукацыі».

Дырэктарка падчас размовы падкрэсліла, што яе сын ужо вучыцца ў гэтай школе, што яе цалкам задавальняе ўзровень адукацыі і пераводзіць яго ў іншую яна і не думае. А малодшая дачка дырэктаркі пойдзе ў Астрашыцка-Гарадоцкую школу ў наступным годзе.

Паводле нашай легенды, маладая мама з дзіцем Колем пераязджае з Расіі. У Лагойску ў сям'і будзе бізнэс. Дырэктарка параіла патэлефанаваць у студзені ці лютым, калі пачнецца запіс у першакласнікі. А пасля расказала пра сваю «школу для Колі».

Паводле яе словаў, дзяцей сюды вязуць адусюль — і з Мінска, і з Лагойска. Развіваюцца і суседнія вёскі — людзі купляюць участкі і адразу ж вядуць дзяцей у элітную школу. Хоць, падкрэслівае Кацярына Махахей, школа звычайная сярэднеадукацыйная. Моцныя бакі — матэматыка і замежная мова. Дарэчы, аднаго настаўніка-«англічаніна» не хапае, таму ахвотныя вучыць Колю могуць звяртацца ў школу.

Дырэктарку радуе вялікая цікавасць да школы, параўнальная нават з ажыятажам. Наконт набору вучняў яна расказала, што астрашыцкіх дзяцей яны павінны браць усіх, але астатніх — на ўласны выбар. Таму дзяцей абы-якіх бацькоў, якія, напрыклад, стаяць на ўліку ў міліцыі, у школу хутчэй за ўсё не возьмуць. «Нас падтрымлівае дзяржава, нам актыўна дапамагаюць бацькі», — расказвае Кацярына Махахей. Сапраўды, калі самы доўгачаканы бацька працягне фінансаванне, школа не будзе ведаць бяды.

Элітных класаў, падкрэслівае дырэктарка яшчэ раз, няма. «Ёсць у нас дзеці і вельмі забяспечаных людзей, але разам з імі вучацца і звычайныя дзеці, чые бацькі ўсё жыццё пражылі ў Астрашыцкім Гарадку. І нікуды ад гэтага не дзенешся...» Сёлета ў школу набралі 48 першакласнікаў, тры класы. Але ці ёсць сярод іх Коля Лукашэнка, высветліць так і не ўдалося.

## Коннае падарожжа па рэзідэнцыі Лукашэнкі

Заняткі ў школе пачынаюцца ў 8.30. Сняданкі вучні атрымліваюць бясплатныя, за абеды трэба даплачваць, але сімвалічную суму — 3000 рублёў.

Кацярына Махахей пастаянна падкрэслівала, што ў школу ўкладзена вельмі шмат сродкаў і што ім вельмі пашанцавала, бо для сельскай школы гэта нетыпова. Вучаць дзяцей падрыхтаваныя спецыялісты — палова настаўнікаў з вышэйшай катэгорыяй. Каля 75% працэнтаў сёлетніх выпускнікоў паступілі ва ўніверсітэты. Для параўнання — прыкладна такія ж паказальнікі ў абласных ліцэях краіны.

Дырэктарка адразу адзначыла, што школа расейскамоўная і ўсё выкладанне ідзе па-расейску.





**Пад'езд да школы застаўлены аўтобусамі.**



**Унутраны дворык «звычайнай» вясковай школы.**

«Не хвалюйцеся, беларуская мова будзе для дзіцяці як другая замежная, — «супакоіла» яна. — Чаму б яе не вывучыць? Можа, калі-небудзь спатрэбіцца».

Кампанія для дзіцяці падбярэцца спартыўная — у Астрашыцкім Гарадку будуць вучыцца хакейныя каманды 1994–1998 гадоў нараджэння поўным складам. «Гэта вельмі прэстыжна», — радуецца дырэктарка.

У красавіку павінен запрацаваць басейн, зараз ідзе яго актыўнае будаўніцтва. У «звычайнай» сельскай школе таксама будзе прагумаванае футбольнае поле.

Навучэнцы могуць катацца ў Раўбічах, прычым плацяць яны толькі за аўтобус. Сам жа адпачынак бясплатны. А вось конным спортам і хакеем школьнікі змогуць займацца на тэрыторыі рэзідэнцыі кіраўніка дзяржавы. Карацей, у гасцях у Колі.

Ёсць шмат гурткоў — і тэатральны, і вакальны, што дзіўна для сельскай школы. Хапае і праграм для адаптацыі дзяцей да школы. Напрыклад, для першакласнікаў за пяць месяцаў да пачатку вучобы па суботах пачынаюцца падрыхтоўчыя заняткі, на якіх дзіця ў гульнёвай форме знаёміцца са сваімі будучымі аднакласнікамі і настаўнікамі.

...Калі мы выязджалі з вёскі, услед за машынай беглі вясковыя дзеці, у гумовых ботах і кофтах, якія, відаць, засталіся ад старэйшых братоў, бо былі на пару памераў большыя. Хлапчукі спаборнічалі, хто першы дагоніць нашае аўто, якое з чарапашай хуткасцю перапаўзала калдобіны, і прыкладзецца рукой да багажніка. З крыкамі «я пайшоў на абгон!» яны, шчаслівыя ад сваёй беспакаранасці, тузаліся перад машынай і дражніліся. Ці ўяўляюць гэтыя дзеці, што праз тыдзень яны хутчэй за ўсё апынуцца за суседнімі партамі з маленькім генералам?

**Віталь Несцераў**




# «Корреспондент»: У Беларусі весці бізнес прасцей, чым у Польшчы ды Іспаніі

**Украінскі часопіс зрабіў тэмай нумара «беларускі эканамічны цуд».**

Чарговы выпуск украінскага часопіса «Корреспондент» выйшаў з выявай Лукашэнкі на вокладцы і загалоўкам «Беларускі цуд». Тэма нумара — ліберальныя рэформы ў Беларусі, іх вынікі і планы на будучыню. Прычынай для абрання такой тэмы стала траплянне Беларусі ў штогадовым рэйтынгу ўмоваў вядзення бізнесу ад World Bank на 58-е месца.

«На вокладцы гэтага нумара — эканамічныя рэформы ў Беларусі. Так-так, учорашняя краіна-ізгой на чале з былым старшынёй калгаса з дыктатарскімі замашкамі шчыра спрабуе стаць сяброўскай для прадпрымальнікаў. Прычым, не толькі для сваіх, але і замежных», — піша пра беларускі нумар у сваім блогу на сайце часопіса журналіст выдання Віталь Сыч. Ён нагадвае, што ў рэйтынгу World Bank беларусы абагналі ў гэтым годзе палякаў, італьянцаў, іспанцаў і чэхаў. І падкрэслівае, што такіх ашаламляльных поспехаў Беларусь дамаглася вымушана, страціўшы папярэдне падтрымку Расіі.

У артыкуле «Беларускі цуд», які ў часопісе займае чатыры старонкі, у якасці прыкладу паспяховага вядзення бізнесу ў Беларусі прыводзіцца досвед банкіра Лявона Ханікяна. Намеснік старшыні праўлення Беларускага банка малога бізнесу (ББМБ) некалькі гадоў займаўся бізнесам ва Украіне, а пасля перабраўся ў Беларусь. Па яго словах, хоць банк і выйшаў на беларускі рынак адначасова з надыходам сусветнага фінансавага крызісу восенню 2008 года, прыбытковым ён стаў ужо менш чым праз год. «І ўсё дзякуючы ліберальным рэформам, якія ў Беларусі праводзяць на працягу апошніх трох гадоў».

Міністр эканомікі Беларусі Мікалай Снапкоў на старонках «Корреспондента» расказвае пра праведзеныя і запланаваныя ў краіне рэформы.

«Мы ўзялі інтэрв'ю ў міністра эканомікі Беларусі. Дык вось, у яго нават офіс падобны на заходнюю кампанію. У нашых жа міністраў — дываны і залатыя папяльнічкі», — не стамляюцца здзіўляцца вестэрнізацыі беларускай эканомікі ўкраінскія журналісты.

**Сямён Печанко**

## Як Расію прадавалі

**На інтэрнэт-аўкцыён eBay выставілі лот «Motherland (Russia)», стартавая цана — $0,99.**

26 жніўня на інтэрнэт-аўкцыёне eBay быў размешчаны лот пад назвай «Motherland (Russia)». Як паведамляе сайт Softodrom.ru, стаўкі мусілі прымацца да 2 верасня. У апісанні лота паведамлялася наступная інфармацыя:

Назва лота: Расія.

Колер: Чырвоны. Пакуль яшчэ.

Памер: 17075400 кв. км.

Вага: Нашмат меншая, чым яна думае.

Асаблівасці: Вельмі паспяховая ў вынішчэнні ўласнага народа (да некалькіх дзясяткаў мільёнаў за паўстагоддзя).

Лот «Motherland (Russia)» пратрываў на eBay нядоўга. У ноч на 28 жніўня ён быў зняты з аўкцыёна, калі стаўкі на яго выраслі трошкі больш за 100 даляраў.

Гэта не першы выпадак, калі на eBay выстаўляецца краіна. Так, у 2008 годзе брытанскі карыстальнік прапанаваў наведнікам аўкцыёну Ісландыю за 99 пенсаў. Жартаўнік падкрэсліў, што ў кошт не ўваходзяць дацкая Грэнландыя і спявачка Б'ёрк. Той лот таксама неўзабаве знялі. Але цана на той момант складала больш за 10 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў.

**Сямён Печанко**

**eBay**
амерыканская кампанія, заснаваная ў 1995, пад гэтай назвай вядомая з 1997. Асноўная сфера заняткаў — правядзенне інтэрнэт-аўкцыёнаў. Дадатковыя зацікаўленасці кампаніі — інтэрнэт-крамы, імгненныя плацяжы ды інш.

# Выпівохі-нападнікі, злодзей пад сталом і рабаўнікі з бітамі

**Крымінальны тыдзень Мінска. Піша капітан міліцыі Сяргей Шатрун.**

### Дзетдомавец залез у кавярню

Каля поўначы 24 жніўня нарад групы затрымання Фрунзенскага аддзела аховы патруляваў вуліцы сталіцы. Па радыёстанцыі прапаршчык міліцыі Максім Жарэбін і старшы сяржант міліцыі Сяргей Дрожжа пачулі, што па вул. Я.Маўра, 9 у кавярні «Азарэнне» спрацавала сігналізацыя. Прыняўшы выклік, супрацоўнікі міліцыі ўжо праз 3 хвіліны былі на месцы. Падчас агляду фасада было выяўлена, што ўзламанае адно з вокнаў. Будынак кавярні неадкладна блакавалі. Яшчэ праз некалькі хвілін прыбылі дзве групы затрымання.

Злачынцу лёгка знайшлі. Ён хаваўся... пад сталом. Ім аказаўся выхаванец аднаго са сталічных дзіцячых дамоў 1993 г.н., які збег з яго тыдзень таму і лічыўся ў вышуку. Пазней, пераадольваючы страх і хваляванне, ён раскажа, што ў кавярні спадзяваўся не толькі паваячараць, але і праінспектаваць мясцовую касу.

### Малойчыкі з бітамі

Нядзельным вечарам у дзверы Фрунзенскага аддзела аховы пастукаў малады чалавек. Дзяжурны, выслухаўшы бязладны аповед хлопца, перадаў па радыёсувязі: некалькі хвілін таму па вул. Янкі Маўра тры маладыя чалавекі здзейснілі разбойны напад. Было тое так.

Двое маладых людзей вярталіся дахаты. Нечакана трое маладзёнаў, як у кіно пра кепскіх хлопцаў, з бейсбольнымі бітамі, шматзначна папрасілі закурыць. Пасля кароткай размовы «бейсбалісты» пачалі іх збіваць, пасля чаго забралі мабільныя тэлефоны і схаваліся.

Група затрымання № 1 (старшыны міліцыі Дзмітрый Вітушка і Дзмітрый Стрыхоўскі) і група затрымання № 2 (сяржант міліцыі Аляксандр Саўрук, старшыя сяржанты міліцыі Максім Казелька і Дзмітрый Марціновіч) па прыкметах затрымалі злачынцаў і даставілі іх у РУУС. А з прычыны, што ў затрыманні ўдзельнічаў і службовы сабака Лары, у злачынцаў нават думкі не ўзнікла пра супраціў.

Малойчыкам, якім ўсяго па 20 гадоў, за разбойны напад пагражае да дзесяці гадоў турмы з канфіскацыяй маёмасці.

### Так прасілі, што аж абабралі

Раніцай 19 жніўня каля крамы па вул. Бельскага, як звычайна, трое мужчын пакамечанага выгляду выпрошвалі дробязь у мінакоў, прычым відавочна не на ежу. Мабыць, у той дзень цярпець яны не маглі. Абступілі аднаго з мінакоў, сталі больш настойліва патрабаваць грошай. Скарыстаўшыся разгубленасцю мужчыны, адзін з іх выцягнуў у яго з кішэні мабільны тэлефон, заявіўшы, што мабільнік ён «знайшоў» і верне яго толькі за ўзнагароджанне.

Абураны мужчына запатрабаваў вярнуць яму тэлефон, інакш ён выкліча міліцыю. Яшчэ нядаўна такія рахманыя просьбіты, азвярэўшы ад «нахабства» гаспадара тэлефона, накінуліся на яго. Збіўшы мужчыну і сарваўшы з яго плацінавы ланцужок, яны разбегліся.

Аднак нарад міліцыі аддзела аховы (сяржант міліцыі Аляксандр Саўрук і прапаршчык міліцыі Сяргей Хадаркевіч), які патруляваў недалёка, своечасова падаспеўшы да месца здарэння, затрымаў аднаго з нападнікаў, а яшчэ праз некалькі хвілін сумесна з калегамі (старшыны міліцыі Дзмітрый Вітушка, Дзмітрый Стрыхоўскі і Кірыл Каплан) затрымалі астатніх.

У пацярпелага ў выніку пабояў сур'ёзна пашкоджаныя вочы, таму затрыманым, адзін з якіх неадназова судзімы, давядзецца адказваць не толькі за рабаванне.



## Здарэнні сцісла

**• Хлопца засыпала зямлёй.** У Чавускім раёне Магілёўскай вобласці падчас будаўніцтва калодзежа быў жывым пахаваны чалавек. Трагедыя здарылася ў вёсцы Селішча. 17-гадовы жыхар Магілёва знаходзіўся ў яміне на глыбіні 10–11 метраў. Малады чалавек дапамагаў сваякам капаць калодзеж.

**• У Брэсце затрымалі трох вандалаў з каталіцкіх могілак.** Двое 16-гадовых і адзін 15-гадовы падлетак затрыманыя міліцыяй. Падлеткі прыйшлі на могілкі выпіць піва. Адно з надмагілляў, калі на яго абапёрся адзін з кампаніі, упала. Гэта было своеасаблівым сігналам, каб кампанія пачала выпрабоўваць свае сілы і на астатніх. Па факце вандалізму заведзеная крымінальная справа.

**• Выбух на рыбакомплексе.** У майстэрні кампрэсарнага цэха Магілёўскага рыбакомплекса месціўся газавы балон. У выніку няспраўнасці вентыля адбылася ўцечка газу. Тры работнікі атрымалі апёкі і траўмы.

**• У Ялце кракадзіл адкусіў палец трохгадоваму беларусу.** У тэатры марскіх жывёл «Акваторыя» кракадзіл пакусаў трохгадовага хлопчыка. Хлопчык з бацькамі адпачываў у Алушце.

**• У «Краснасельскбудматэрыялы» прыйшлі людзі ў пагонах.** Праваахоўныя органы вывучаюць дзейнасць найбуйнейшага вытворцы будаўнічых матэрыялаў у Беларусі — ААТ «Краснасельскбудматэрыялы». Апошнім часам на ААТ звярнулі ўвагу і МУС, і КДБ, і пракуратура. Ужо распачатыя дзве крымінальныя справы. Адна — у дачыненні да мінчука, які з мая 2008 па сакавік 2010 нібыта ажыццяўляў незаконную пастаўку на адрас ААТ « Краснасельскбудматэрыялы» сыравіны для вытворчасці будаўнічых матэрыялаў. Паводле падлікаў МУС, за два гады праз незаконныя пастаўкі мінчук здолеў зарабіць 1,8 млрд рублёў. Другая справа распачатая пракуратурай па матэрыялах аператыўнай распрацоўкі КДБ і Галоўнага ўпраўлення ўласнай бяспекі МУС. Галоўны інжынер-тэхнолаг ААТ «Краснасельскбудматэрыялы» і былы начальнік аддзялення дазнання Ваўкавыскага РАУС падазраюцца ў крадзяжы будматэрыялаў з тэрыторыі прадпрыемства.

**• Перарэзала горла дачцэ.** Дзяўчына, якой быў 21 год, вучылася на 4 курсе БДУ. І – нешта здарылася. Пасля таго, што адбылося, маці паспрабавала перарэзаць горла і сабе. Хуткую дапамогу і міліцыю выклікаў сын, які прыйшоў з працы і ўбачыў у кватэры жудасную карціну. Маці забітай стаіць на ўліку ў псіханеўралагічным дыспансеры.

**• У Баранавічах мужчына ўпаў з балкона.** Цела на зямлі каля шматпавярховіка знайшла каля сёмай раніцы мясцовая жыхарка. Ідзе следства.

**• Наехаў на аднавяскоўца ў вёсцы Стрыпінь.** ДТЗ адбылося а другой гадзіне ночы. 22-гадовы жыхар гэтай вёскі на аўтамабілі «Аўдзі-100» наехаў на чалавека, які ляжаў на праезнай частцы. Апошні памёр на месцы. Нябожчык не меў флікераў.

**СМ**

# Нелінейная логіка катастрофаў

Парадаксальная думка фізіка Сяргея Курдзюмава палягае ў тым, што будучыня як бы прыцягвае да сябе працэсы ў цяперашнім.
Піша **Віталь Тарас**.



31 жніўня 1986 года патануў пасажырскі цеплаход «Адмірал Нахімаў». У Чорным моры блізу Наварасійска загінулі 423 чалавекі з 1234. Большасць ахвяраў была з Украіны — 267 чалавек і РСФСР — 72, трое — з Беларусі... Судна здзяйсняла турыстычны круіз па лініі Крым—Каўказ. Для «Адмірала Нахімава», які выйшаў у той дзень з Ялты, рэйс у любым выпадку павінен быў стаць апошнім. Пасля гэтага судна збіраліся адправіць на злом.

### Савецкі «Тытанік»

Трагедыя адбылася ў Цэмескай бухце — той самай, на беразе якой савецкія войскі ўвосень 1943 утрымлівалі плацдарм, вядомы пад назвай «Малая зямля». (Між іншым, капітан «Адмірала Нахімава» вадзіў перад тым розныя караблі — адзін з іх насіў імя «Леанід Брэжнеў».)

Гэта здарылася ў раёне мыса Даоб у 23.15. Начное паветра было крыштальна чыстым. Ва ўмовах амаль поўнага штылю не заўважыць агромністы цеплаход, які нагадваў добра ілюмінаваны хмарачос, было немагчыма. Безумоўна, яго бачылі на борце сухагруза «Пётр Васёў», які апынуўся побач. Заўважылі і «Пятра Васёва» на борце «Адмірала Нахімава». Але яго капітан пайшоў спаць, даручыўшы кіраванне свайму памочніку. Да апошняга моманту абодва судны ішлі кожнае сваім курсам, хоць гэта яўна пагражала сутыкненнем. Спачатку ніхто не хацеў саступаць, а потым было позна... «Пётр Васёў» пратараніў борт пасажырскага карабля.

«Адмірал Нахімаў» патануў за сем хвілін. У тагачаснай прэсе яго потым назавуць «савецкім «Тытанікам». Чымсьці крушэнне ў Чорным моры, пэўна, нагадвала кадры з фільма, знятага Джэймсам Кэмеранам пры канцы 1990-х. (Рэальны «Тытанік», як вядома, патануў пры сутыкненні з айсбергам у Атлантыцы ў 1912.) Толькі рэальнасць куды больш жорсткая і неэстэтычная, чым кіно. Паводле ўспамінаў аднаго з відавочцаў трагедыі 1986-га, «...людзі трымаліся за леера і ўсё, за што можна было зачапіцца... З адчыненых ілюмінатараў цягнуліся рукі няшчасных людзей, якія не змаглі выбрацца са сваіх кают у час». (Цыт. паводле расійскай Вікіпедыі.) У халоднай вадзе апынуліся каля тысячы чалавек, якія боўталіся сярод шматлікіх прадметаў ды аскабалкаў, перапэцканыя фарбай з сухагруза і мазутам. Адзіным сродкам ратавання спачатку былі надзіманыя плоцікі з «Адмірала Нахімава». Потым падышоў катар... Усяго ўдалося выратаваць 836 чалавек.

Гэтая лічба афіцыйна была агучана 4 верасня ў Маскве. Колькасць ахвяр не называлася. Паведамлялася толькі, што на той дзень было паднята 116 целаў. Пошукі астатніх былі спынены 10 верасня, пасля таго як пры аглядзе патанулага карабля загінуў адзін з вадалазаў. Глыбіня на месцы крушэння — 47 метраў.

### Адмірал і два капітаны

Урадавую камісію, якая займалася катастрофай пад Наварасійскам, узначальваў член Палітбюро ЦК КПСС Гейдар Аліеў. Перад тым ён узначальваў камісію, якая займалася расследаваннем катастрофы на Волзе — пасажырскае судна на поўнай хадзе ўрэзалася ў мост, у выніку чаго знесла ўсю верхнюю палубу разам з капітанскім масцікам. Як у вядомай расійскай песні: «на палубу вышел — палубы нет».

Гісторыя «Адмірала Нахімава» заслугоўвае асобнага рамана. Ён быў пабудаваны ў 1925 годзе ў Германіі пад назвай «Берлін». Да 1938 года параход ажыццяўляў рэгулярныя рэйсы паміж портам Брэмерхафен і Нью-Ёркам. Падчас Другой сусветнай судна выкарыстоўвалася ў якасці плывучага шпіталя.

У студзені 1945 «Берлін» падышоў да Лібавы для эвакуацыі нямецкай курляндскай групоўкі. Судна было падбіта савецкай тарпедай, але працягвала рухацца. Ля порта Свінэмюндэ яно падарвалася на нямецкім мінным полі і лягло на глыбіні 18 метраў. Частка карабля заставалася ў наводным становішчы.

У 1947-м годзе судна з другой спробы паднялі і перавялі ў Кранштат пад новай назвай — «Адмірал Нахімаў». З 1957 карабель належаў Чарнаморскаму марскому параходству. (Порт прыпіскі — Адэса.) У 1962 годзе, падчас Карыбскага крызісу, на ім перавозілі савецкіх салдат на Кубу пад выглядам сельскагаспадарчых рабочых.

Амаль усе караблі, якія насілі імя Нахімава, цярпелі крушэнні. У 1897 годзе грузавы параход «Нахімаў» патануў ля берагоў Турцыі. Савецкі крэйсер «Чырвона Украіна» (ранейшая назва — «Адмірал Нахімаў») быў патоплены ў 1941 годзе.

Расійскі адмірал Нахімаў, нагадайма, загінуў пры абароне Севастопаля падчас Крымскай вайны 145 гадоў таму — у чэрвені 1855 года.

Пасля трагедыі пад Наварасійскам абодвух капітанаў судзілі. Капітан «Адмірала Нахімава» Вадзім Маркаў атрымаў чатыры гады за халатнасць. Капітан «Васёва» Віктар Ткачэнка — дзесяць. Абодвух выпусцілі на свабоду датэрмінова ў 1992-м.

Ткачэнка з'ехаў у Ізраіль. У 2003 годзе ён патануў на сваёй яхце ў Атлантыцы, у раёне Ньюфаўндленда. (У тым самым раёне некалі пацярпеў крушэнне «Тытанік».) Маркаў памёр у Адэсе ў 2007-м пасля працяглай хваробы.

### Усю сістэму трэба мяняць

Але вернемся ў верасень 1986-га. Што казаць пра нежаданне ўладаў называць лічбы загінулых у Цэмескай бухце... Праз некалькі тыдняў пасля трагедыі пад Наварасійскам у Маскве адбылася прэс-канферэнцыя на іншую тэму: Чарнобыль. (У прэс-канферэнцыі ўдзельнічаў, сярод іншых, першы сакратар Гомельскага абкама КПБ Камай.) Але яна нагадвала хутчэй рапарт пра савецкія дасягненні. «Клопат пра чалавека ў нашай краіне заўсёды быў галоўным... (гэта цытата з паведамлення ТАСС) ...і калі здарылася бяда, на першым месцы ставілася задача, як дапамагчы людзям, як аблегчыць іх лёс. Савецкая дзяржава цалкам кампенсавала матэрыяльныя страты грамадзян, пацярпелых пры аварыі на АЭС». Далей паведамлялася, што прамянёвую хваробу атрымалі ўсяго 208 чалавек, з іх 29 памерлі, што новых выпадкаў захворвання няма і што загінулі толькі тыя, хто атрымаў звышцяжкія дозы апраменьвання. І — ні слова пра радыяцыйнае забруджванне, небяспеку радыенуклідаў. Нават самога слова «радыяцыя» ТАСС пазбягаў!

Гібель «Адмірала Нахімава» здарылася ўсяго праз чатыры месяцы пасля Чарнобыля. І таму ва ўспамінах сучаснікаў застаецца як бы ў цені той гіганцкай катастрофы. Але яна была далёка не адзінай і не апошняй.

Праз месяц пасля крушэння «Нахімава» ў Атлантыцы, у раёне Бермудскіх астравоў, успыхнуў пажар на савецкай атамнай падлодцы К-219. Чатыры маракі загінулі адразу, яшчэ чацвёра памерлі пасля вяртання.

У снежні 1986-га — гібель людзей на шахце «Ясінаўская-Глыбокая» ў Данбасе. Урадавая камісія тады так і не паведаміла, колькі людзей загінула. Іх было 25.

У чэрвені 1988 у выніку выбуху на чыгуначнай станцыі ў Арзамасе загінуў, згодна з афіцыйнымі звесткамі, 91 чалавек.

Спіс можна працягваць. Але важней адказаць на пытанне — наколькі яны (а таксама і ўсе наступныя катастрофы) былі выпадковымі? Выявіць нейкую агульную заканамернасць у тэхнагенных аварыях альбо аварыях, выкліканых «чалавечым фактарам», цяжка.

Праўда, у выпадку з катастрофамі перыяду гарбачоўскай «перабудовы» ўсё выглядае больш-менш ясным. Дысцыпліна пры Гарбачову ўпала, пры Андропаву ці пры Сталіну такога не было б — упэўнена скажуць адны. Выпрацаваўся матэрыяльны рэсурс, савецкае абсталяванне састарэла, дый грошай у казне стала менш праз падзенне цэнаў на нафту — скажуць іншыя.

І ўсё ж цяжка пазбавіцца адчування, што тое было прыкметай часу. І не толькі ў тым сэнсе, што тэрмін эксплуатацыі старых машын і тэхналогій скончыўся і трэба было мяняць, як у анекдоце пра сантэхніка, усю сістэму.

### Нелінейны светагляд ці рука Провіду?

Сёлета ў жнівеньскім нумары расійскага часопіса «Знание — сила» апублікаваны ўспаміны пра акадэміка РАН Сяргея Курдзюмава, які памёр два гады таму. Імя яго нічога не гаворыць шырокай публіцы. А ён быў выдатным матэматыкам і фізікам-тэарэтыкам, паслядоўнікам знакамітага бельгійскага фізіка, філосафа Ільі Прыгожына ў галіне так званай сінергетыкі. У аснове яе ляжыць тое, што называюць «нелінейным светапоглядам»...

Вось адно з выказванняў Курдзюмава: «Трэба ведаць паводзіны складаных сістэм, ведаць іх унутраную патэнцыю развіцця, рабіць іх адпаведнымі гэтаму свету, а не нявечыць яго, не ствараць тое, што няўстойлівае, распадаецца, вядзе да катастрофаў...» Адна з найбольш парадаксальных думак навукоўца палягае ў тым, што будучыня як бы прыцягвае да сябе працэсы ў цяперашнім. То бок яны вызначаюцца будучыняй, будуюцца з будычыні.

Гэта з навуковага гледзішча. А з гледзішча хрысціянскай рэлігіі гэта можна назваць «рукой Провіду».

Катастрофы канца 1980-х — пачатку 1990-х, у тым ліку і так званая найвялікшая катастрофа XX стагоддзя, былі прадвызначаны будучыняй. Злом існуючага парадку проста не мог не адбыцца, бо рух у ранейшым кірунку вёў у тупік.

Апошнім часам падобныя аварыі і катастрофы зноў пачасціліся. З апошніх паведамленняў — пяць членаў экіпажа буксіра, які пацярпеў аварыю ў Моры Лапцевых, знойдзены мёртвымі, яшчэ шэсць зніклі без вестак. Перад тым былі «Кульгавы конь» (на дыскатэцы згарэлі 156 чалавек), Саяна-Шушанская ГЭС (загінулі 75 чалавек), сёлета ў маі — катастрофа на шахце «Распадскай», дзе ў выніку серыі выбухаў загінулі 66 чалавек. Апошні выпадак падаецца асабліва паказальным. Некалькі дзясяткаў гарнякоў маглі заставацца жывымі ў шахце, але спробы іх выратаваць былі спынены начальствам праз «безнадзейнасць сітуацыі». 24 чалавекі лічацца зніклымі без вестак.

Напрошваецца параўнанне з тым, што адбываецца цяпер у Чылі. Там знайшлі гарнякоў меднай шахты на сямнаццаты дзень пасля аварыі, калі ўжо, здавалася, не было ніякай надзеі. Да іх прабілі вузенькі тунэль. Каб вывесці шахцёраў з-пад зямлі, трэба прабіць яшчэ адзін тунэль, значна большы, а на гэта спатрэбіцца не адзін месяц. Усе чылійцы жывуць надзеяй на ўратаванне шахцёраў. Ім перадаюць пад зямлю прадукты, мабільныя тэлефоны, лісты сваякоў, прэсу. Перадалі нават мініяцюрную камеру, і адзін з гарнякоў зняў відэарэпартаж, які глядзела ўся краіна. Салідарнасць з'яднала нацыю.

А што ж Беларусь? Ад катастрофаў нас Бог пакуль аберагае. Хоць наступстваў Чарнобыля хопіць на стагоддзі.

Як доўга будзе працягвацца наш убогі дабрабыт, упартае нежаданне змен? І наколькі вялікі перад намі веер магчымых шляхоў эвалюцыі? Адказ на гэтае пытанне — не ў мінулых катастрофах, але ў тых, што нас чакацьме наперадзе. Будучыня будуе сама сябе.

Але не без нашага ўдзелу, і галоўнае — не без нашага выбару.

# Сідорскі вызначыўся

Піша **Андрэй Дынько**.

Прэм'ер-міністр Беларусі зрабіў 25 жніўня шэраг перадвыбарчых заяваў.

Заробак не ўпадзе з дасягнутых 500 далараў пасля выбараў. Жытла ў Беларусі ў наступнай пяцігодцы будуць будаваць рэкордна шмат. Фінансаванне дзяржпраграмы інавацыйнага развіцця ўзрасце ў 4,5 разу.

Звычайныя перадвыбарчыя планы: часткова яны, напэўна, рэалізуюцца.

Але Сідорскі выступаў з імі не як кандыдат. Ён абслугоўваў піяр-схему Аляксандра Лукашэнкі. Таму час у Сідорскага таксама дзеліцца на пяцігодкі. І рост ВУП супадае з задачамі, пастаўленымі прэзідэнтам.

Між тым, многія ў апазіцыі спадзяваліся, што Сідорскі можа пайсці ў апазіцыю Лукашэнку. «Пара вызначацца!» — звярталася да яго «Народная воля».

«Размова, быццам стужка Мёбіюса, перацякае па трох прозвішчах: Саннікаў—Сідорскі—Някляеў, сканчаючыся ціхім «уж лучше кто-то из них», пісаў на «Хартыі-97» Мікалай Халезін.

«Калі Сідорскі [вылучыцца], мы яму дапаможам», — казаў Някляеў.

А ўсё чаму? А таму што (чарговы «генерал» пераходзіць на шэпт) «у Маскве» ўсе гавораць пра Сідорскага.

Не вылучыцца.

Гэтае рашэнне Сідорскага прадыктаванае настроямі дырэктарата, які за ім стаіць.

Варта ўважліва ўглядзецца ў іншыя паветраныя замкі, якія выбудавалі сабе і нам палітыкі, якія спадзяюцца змяняць палітычную сітуацыю ў Беларусі з дапамогай Масквы.

# На расійскую амбасаду ў Мінску нападалі тройчы



PHOTO.BYMEDIA.NET

Усе інцыдэнты адбываліся ў ноч на першы або апошні дзень месяца.

Першыя два напады звязвае тое, што супраць расійскай амбасады выкарыстоўвалі расійскую зброю. Апошнія два здарыліся незадоўга да чарговай прэзідэнцкай кампаніі.

### 1997

У ноч на 1 красавіка 1997 г. будынак дыппрадстаўніцтва быў абстраляны з аўтамата Калашнікава. Сляды ад куль былі не толькі на сценах амбасады, але і суседняга жылога дома. Побач з месцам здарэння знайшлі кінуты аўтамат і гільзы. Ніхто не пацярпеў.

Інцыдэнт паклаў пачатак серыі здарэнняў надзвычайнага характару. 4 красавіка ў Мінску на вул. Авакяна прагрымеў выбух у пад'ездзе жылога дома. 28 красавіка выбухнула газакампрэсарная станцыя ў Крупках, а 30 красавіка — участак газаправода каля Узды. 10 верасня таго ж года спрацавала выбуховае прыстасаванне ў будынку Савецкага і Мінскага раённых судоў. 6 кастрычніка ў Магілёве ў пад'ездзе свайго дома ў выніку выбуху загінуў кіраўнік Камітэта дзяржкантролю па Магілёўскай вобласці Яўген Мікалуцкі. У сувязі з выбухамі ў судзе і на газаправодзе ў прэсе з'явілася інфармацыя пра з'яўленне так званага Беларускага вызвольнага войска, якое нібыта ўзяло на сябе адказнасць за гэтыя акты. У Беларусі пачалася праца над дэкрэтам «Аб тэрарызме».

### 2001

У ноч на 1 чэрвеня 2001 г. на тэрыторыю пасольства невядомыя закінулі выбухоўку. Была пашкоджаная агароджа, ніхто не пацярпеў. Інцыдэнт здарыўся за некалькі гадзін да прыбыцця на мінскі саміт кіраўнікоў СНД тагачаснага прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна. Інфармагенцтвы распаўсюдзілі інфармацыю, што на тэрыторыю амбасады кінулі ручную гранату РГД-5 расійскай вытворчасці. Супрацоўнікі дыппрадстаўніцтва заявілі пра выкарыстанне двух выбухпакетаў. Адказнасць за выбух браў на сябе паэт Славамір Адамовіч. Праўда, ён зрабіў тое двухсэнсоўна, і праваахоўныя органы не прынялі яго заяваў усур'ёз. Прынамсі, следства па іх не вялося.

### 2010

У ноч на 31 жніўня 2010 г. невядомыя закідалі тэрыторыю расійскай амбасады пляшкамі з запальнай сумессю. Згарэў службовы легкавік. Ніхто не пацярпеў.

**Сямён Печанко**

# Дзяржвдума не верыць у датычнасць лукашыстаў, «Адзіная Расія» — верыць

Старшыня камітэта расійскай Дзяржвдумы па справах СНД і сувязях з суайчыннікамі Аляксей Астроўскі заявіў, што інцыдэнт на тэрыторыі амбасады Расіі наўрад ці быў ініцыяваны прадстаўнікамі ўладаў Беларусі. Гэтую ролю ён адвёў некаторым сілам, якія такім чынам выкарыстоўваюць «напружаныя моманты ў расійска-беларускіх адносінах з тым, каб яшчэ больш іх абвастрыць і пагоршыць».

А вось кіраўнік палітычнага дэпартамента кіруючай партыі «Адзіная Расія» Аляксей Чадаеў упэўнены, што беларуская ўлады ведалі пра падрыхтоўку нападу і пры гэтым не прадухілілі яго: «Можна меркаваць, што спецслужбы Беларусі валодалі інфармацыяй па акцыі, якая рыхтавалася». Ён мяркуе, што «сілы правапарадку не прадухілілі гэты інцыдэнт ля расійскай амбасады», дзе ўсё ахоўваецца.

### РЭАКЦЫІ

• **Рух «За Свабоду»: адносіны з Расіяй могуць пагоршыцца.** Так мяркуе адзін з заснавальнікаў Руху — Алесь Лагвінец. Намеснік кіраўніка арганізацыі Юрась Губарэвіч мяркуе, што сітуацыя можа быць аднолькава выкарыстана як беларускімі ўладамі, так і расійскім бокам.

• **Фядута: гэта нагода для інфармацыйнай атакі на Беларусь.** Палітолаг, блізкі да кампаніі «Гавары праўду», адзначае: «Гэта не першы выпадак, калі на тэрыторыю расійскай амбасады ў Мінску нешта кідаюць. Падобнае бывала і раней, і ўлады заўсёды вінавацілі ў такіх інцыдэнтах апазіцыю. Я перакананы, што да гэтага інцыдэнту апазіцыя не мае дачынення. Сёння нават самыя антырасійскія сілы ў Беларусі не выкарыстоўваюць падобных метадаў».

**АП, ЮМ**

# Што такое «кактэйль Молатава»

Гісторыкі дагэтуль не вызначыліся, хто першы выкарыстаў бутэльку з запальнай сумессю.

«Кактэйль Молатава» — пляшка з запальнай сумессю. Перад выкарыстаннем корак (часцей з каванка анучы) падпальваецца. Пляшка кідаецца ў аб'ект атакі, разбіваецца. Вадкасць разліваецца і ўспыхвае.

Па версіі кубінскіх гісторыкаў, такую зброю ўпершыню выкарыстаў на Кубе 20 ліпеня 1895 г. у вайне за незалежнасць ад Іспаніі. Іспанцы ж настойваюць, што першая «бензінавая бомба» была ўжытая супраць танкаў рэспубліканскай арміі Франка ў 1936 г. у часе грамадзянскай вайны. Фінскія гісторыкі кажуць, што той «кактэйль Молатава», які сёння ведае ўвесь свет, прыдумаў іхні вайсковец. І паджэнтльменску адзначаюць, што ў часе працы ўлічваўся вопыт іспанскай «бензінавай бомбы». Прэтэндуюць на стварэнне агнявога кактэйлю і расійцы.

Назвай кактэйль абавязаны шэфу савецкага МЗС Вячаславу Молатаву. У часе савецка-фінскай вайны Хельсінкі моцна пацярпеў ад бамбаванняў. Молатаў жа заяўляў у часе радыёвыступаў, што на фінскую сталіцу сыплюцца не запальныя бомбы, а пакункі з харчам. З гэтага часу савецкія бомбы пачалі называць «хлебніцамі Молатава», а бутэлькі з запальнай сумессю, якімі фіны падпальвалі савецкія танкі, — «кактэйлем Молатава».

Танны і просты ў выкарыстанні «кактэйль» часта называюць зброяй бедных. Найперш ён выкарыстоўваецца супраць бронетэхнікі. Аднак сучасная танкавая тэхніка, як і зброя супраць сябе, значна ўдасканаліліся, таму ў прамысловых маштабах пляшкі з запальнай сумессю перасталі выпускаць. «Кактэйль Молатава» паранейшаму застаецца зброяй вулічных дэманстрантаў па ўсім свеце.

**Падрыхтаваў СП**

### 1 ВЕРАСНЯ

# Не задаволілі права на беларускамоўнае навучанне

Але Юлія Бука з Глыбоччыны знайшла магчымасць вучыць сваю дачку на роднай мове.

За тыдзень да пачатку навучальнага года жанчыне паведамілі, што яе дачка не зможа вучыцца ў беларускамоўным класе. Два пятыя класы Глыбоцкай раённай гімназіі, куды дзяўчынка паступіла яшчэ вясной, будуць расейскамоўнымі. Справа атрымала працяг.

Спадарыня Юлія звярнулася ў Глыбоцкі райвыканкам, дзе адбылася размова з намеснікай старшыні. На наступны дзень да яе ў Валодзькава прыехаў дырэктар адной са школ. Ён запрасіў жанчыну на бацькоўскі сход. На ім сабраліся бацькі дзяцей, якія чатыры гады ў гімназіі вучыліся па-беларуску, а цяпер перайшлі на расейскамоўнае навучанне.

Спадарыня Юлія кажа, што бацькоў фактычна сабралі для таго, каб пераканаць яе ў тым, што ніхто не хоча вучыцца па-беларуску.

Выявілася, што яшчэ дзве сям'і хацелі б аддаць сваіх дзяцей у беларускамоўны клас. Гэта таксама былі вучні вясковых школ. Але большасць бацькоў пачала іх абражаць. Маўляў, хай вяскоўцы вяртаюцца ў свае школы.

Калі скончыўся сход, Юлія зайшла ў сярэднюю школу №3. Як высветлілася, там набралі беларускамоўны клас. І дзяўчынку гатовы прыняць пры ўмове, што вырашыцца пытанне з жытлом. Дырэктарка гімназіі паабяцала пасяліць пяцікласніцу ў вучнёўскім інтэрнаце, дзе жыве яе старэйшы брат.

Юлія Бука на гэтым спыняцца не збіраецца. Яна мае намер схадзіць на прыём да старшыні Глыбоцкага райвыканкама.

«Я хачу дамагчыся, каб нас не прыніжалі».

**Сяргей Макарэвіч**

# Нашы школы за мяжой

У Рыгу накіравалася транспартная калона з абсталяваннем для адзінай у Латвіі беларускай школы. Такім чынам выконваецца даручэнне Аляксандра Лукашэнкі аказаць усебаковую падтрымку навучальнай установе.

**Латвія.** Гісторыя беларускамоўнай адукацыі ў гэтай краіне сягае ў 20—30-я гады мінулага стагоддзя. На той час тут дзейнічала каля 50 беларускіх пачатковых школаў. У 1945 годзе тут не засталося ніводнай беларускамоўнай школы. Рыжская беларуская школа пачала працу ў 1994 годзе. На сёння гэта адзіная беларуская школа ў Латвіі. Цяпер тут вучыцца 130 вучняў.

**Літва.** Віленская сярэдняя школа імя Скарыны — адзіная беларускамоўная ў Літве. Яе называюць пераемніцай традыцый знакамітай Віленскай беларускай гімназіі, што дзейнічала ў 1919—1944 гг. Сёння ў віленскай школе займаецца каля 180 вучняў. Фінансуецца яна літоўскім урадам.

**Польшча.** Тут беларуская мова вывучаецца на розных узроўнях — пачынаючы з дзіцячых садкоў (па адным у Беластоку і Гайнаўцы), да ўніверсітэтаў. Сёння ў Польшчы беларускую мову ў 38 навучальных установах — дзіцячых садках, пачатковых школах, ліцэях і гімназіях — вывучае 3044 чалавекі.

**Эстонія.** Міністэрства адукацыі Эстоніі дало дазвол на стварэнне беларускай нядзельнай школы ў Таліне. Яна будзе насіць імя У.Караткевіча.

**Расія.** У Расіі беларускую мову пакуль не вывучаюць у школах, але жаданне ёсць у маскоўскіх і іркуцкіх беларусаў.

**Чэхія.** Чэшскія беларусы не здолелі паразумецца паміж сабой: адны бацькі не ўгледзелі практычнай патрэбы ў навучанні па-беларуску, другіх не задаволіла месца. Таму нядзельная школка так і не запрацавала.

**СП**

# Сачыце за камерай

**Некалькі фатаграфій ва ўмелых руках могуць стаць зброяй.**

Гэта адзін з самых «моцных» здымкаў часовага павераннага ў справах Эстоніі ў Беларусі Хары Лахтэйна. Ён выклікаў хвалю абмеркаванняў.

Большасць каментатараў угледзела тут няякасную кампаноўку з некалькіх здымкаў з дапамогай камп'ютарнай праграмы «Фоташоп». Насамрэч у вочы кідаецца неадпаведнасць колераў і асвятлення на розных участках здымка. У дадатак, рука мужчыны (на фота абведзеная авалам) дакранаецца да дзяўчыны вельмі ўжо ненатуральна. Дый даўжыня рукі, скажам так, ненатуральная.

Гэтая ненатуральнасць яшчэ больш выразная на наступным здымку. Паўпразрыстыя пальцы і рукі сведчаць альбо аб апрацоўцы здымка ў графічным рэдактары, альбо аб рэнтгенаўскім выпраменьванні фотакамеры. Але ж апошняе немагчыма.

Аматары фатаграфіі могуць нават ацаніць усе параметры, пры якіх рабіліся здымкі.

Дарэчы, мадэль камеры, выкарыстаная незадаволенай беларускай, зусім не належыць да ліку звычайнага аксесуара дамскай торбачкі. Гэта хоць і адна з самых кампактных, але ўсё ж люстраная камера. Даволі складаная ў кіраванні і патрабуе немалога запасу ведаў і ўменняў. Яна не толькі важыць разам з аб'ектывам пад кілаграм, але яшчэ і займае нашмат больш месца, чым звычайныя мыльніцы. Навошта гэта ўсё цягаць з сабой па рэстарацыях? Адказ просты. «Кэнан 500Д» дазваляе рабіць фотаздымкі вялікага памеру, акурат прыдатныя для разнастайнай апрацоўкі ў фоташопе.

Карацей, ідэальны варыянт для журналіста, які не хоча прыцягваць увагу прафесійнай апаратурай, але пры гэтым жадае атрымаць здымкі добрай якасці. Дый не толькі журналіста. Для любога, хто хоча падрыхтаваць «моцны» матэрыял.

Сярод апублікаваных здымкаў ёсць і такія, што не выклікаюць ніякіх сумневаў. Аднак, разам з гэтым, яны сведчаць толькі аб тым, што эстонскі дыпламат любіў наведваць сталічныя рэстарацыі ў кампаніі прыгожых дзяўчат. А дзяўчаты на здымках дэманструюць жаданне весела правесці час і ніяк не выглядаюць на недаступных і ганарлівых.

Напэўна, таму дыпламат і контрразведчык Лахтэйн пасля публікацыі здымкаў падаў у адстаўку. Фоташоп быў проста дадатковым аргументам.

**Алесь Пілецкі**



**У вочы кідаецца неадпаведнасць колераў і асвятлення на розных участках здымка.**



**Паўпразрыстыя рукі — вынік апрацоўкі ў графічным рэдактары.**



**Гэты здымак, мабыць, натуральны.**



**Мадэль камеры, выкарыстаная «беларускай», не належыць да лёгкіх.**

# Лахтэйн: не справіўся са спакусамі ці падставілі спецслужбы? І чые службы?

Шырокае гучанне атрымала гісторыя з часовым паверaным у справах Эстоніі ў Беларусі Хары Лахтэйнам. У вядучыя эстонскія СМІ быў разасланы ліст з фотаздымкамі дыпламата ў суправаджэнні розных дзяўчат падчас адпачынку ў рэстаране.

### Ананімная «20-гадовая мінчанка»

Ліст быў ананімны ад імя «20-гадовай мінчанкі», якая пазнаёмілася з эстонцам год таму, а пасля нібыта стала аб'ектам сэксуальных дамаганняў з боку Лахтэйна. У падзяку ён быццам бы зрабіў дзяўчыне і яе сяброўкам шэнгенскія візы.

На першы погляд, здавалася б, нічога канкрэтнага ў гэтых абвінавачваннях няма. Тым больш што самыя кампраметуючыя былі яўна сфабрыкаваныя. Тым не менш, кіраўнік дыпмісіі адразу ж падаў у адстаўку. У МЗС яе прынялі.

Міністр замежных справаў Урмас Паэт заявіў, што «гэта выбар свабоднага чалавека», і ніякіх прычынаў не падпісваць прашэнне не было.

Сам Хары Лахтэйн ад каментароў па справе адмаўляецца. Адзінае, што ён зрабіў — разаслаў сваім калегам па дыпламатычнай працы ліст, дзе абвінавачвае ў правакацыі супраць сябе спецслужбы. Разам з тым, ён не кажа, ці спрабавалі яго ў Беларусі вербаваць альбо за што яму помсціць?

### Контрразведчык

Хто ж такі гэты Хары Лахтэйн? Яму 43 гады. Хары быў першынцам у сям'і кіроўцы «Талінфільма» і бухгалтара Міністэрства культуры.

Пасля школы Лахтэйн вырашыў паступаць на юрыдычны факультэт Тартускага ўніверсітэта. У 1985 годзе з універсітэта быў прызваны ў савецкае войска. Служыў пад Санкт-Пецярбургам.

Лахтэйн прызнаваўся, што пасля арміі вучобу было працягваць цяжка. Тым больш што ў сям'і з'явілася дзіця. Першай жонкай Хары была Крыстэн Лахтэйн. Яна таксама дыпламат. І што самае цікавае: ад 2001 да 2004 узначальвала мінскае аддзяленне пасольства Эстоніі. Да апошняга часу Крыстэн была консулам сваёй краіны ў Санкт-Пецярбургу.

Тэмай дыпломнай працы Лахтэйна было «Міжнароднае права ў галіне паветранага тэрарызму». Эстонец расказваў, што матэрыялаў амаль не было ніякіх.

Давялося звяртацца ў Паліцыю бяспекі (эстонская спецслужба). Гэта было на самым заранку суверэнітэту. Лахтэйну прапанавалі прыйсці ў ведамства на практыку, інакш інфармацыі не атрымаць. Хары так і застаўся працаваць у Паліцыі бяспекі і пасля сканчэння ВНУ.

Там Лахтэйн адпрацаваў шэсць гадоў. У спецслужбе ён працаваў у аддзеле контрразведкі.

### Праца ў Грузіі

Пасля звальнення з Паліцыі бяспекі Лахтэйн узначаліў папулярны талінскі начны клуб «Галівуд». Тым не менш, у хуткім часе падвярнулася магчымасць атрымаць ступень магістра ў ваенна-марскім вучылішчы ў Каліфорніі.

Пасля гэтага Лахтэйн атрымаў пасаду ў Міністэрстве абароны Эстоніі. У 2004 годзе ён быў прызначаны вайсковым дарадцам у Грузіі. У абавязкі Лахтэйна ўваходзіла падрыхтаваць каўказскую краіну для ўступлення ў НАТО.

За час ягонай працы вайсковым дарадцам узнікла ідэя стварэння ў Грузіі пасольства Эстоніі. Яно паўставала практычна з нуля. Лахтэйн і стаў яго першым кіраўніком. Так пачалася дыпламатычная праца Хары. У Грузіі ён працаваў у час ваеннага канфлікту з Расіяй.

Наступным пунктам прызначэння дыпламата стаў Мінск. Менавіта Лахтэйну выпаў гонар адчыняць эстонскае пасольства ў беларускай сталіцы. Раней прыбалтыйская краіна была прадстаўлена ў нас пастаянным прадстаўніцтвам.

Асабліва заўважным сярод дыпламатаў Лахтэйн не быў. Хіба што арганізоўваў візіт у Мінск міністра замежных справаў Урмаса Паэта.

### «Чалавек вырашыў, што ён беспакараны»

Эстонскія СМІ дыпламата, што трапіў у сэкскандал, не выгароджвалі.

Дэпутат эстонскага парламента Ігар Гразін з Партыі рэформаў лічыць, што Лахтэйн проста страціў галаву ў Мінску. «Для маленькага чалавека самым вялікім выпрабаваннем якраз і з'яўляецца сітуацыя, калі ён нечакана і часова трапляе ў ролю сярэднявечнага саноўніка — галава ідзе кругам, шампанскае ліецца ракой (за чужы рахунак!), а ніякай асаблівай работы няма».

Былы эстонскі дыпламат Март Хельме мае падобнае меркаванне. У інтэрв'ю выданню novosti.err.ee Хельме адзначае: «Чалавек вырашыў, што ён беспакараны, што ён можа дазволіць сабе адно, другое, трэцяе і яму нічога за гэта не будзе».

Па словах дыпламата, такія выпадкі зусім нярэдкія. «Як правіла, у цэнтрах такіх скандалаў апынаюцца людзі, якія валодаюць нейкай інфармацыяй, то бок «няўручныя» для пэўных асобаў. І калі на легкадумныя паводзіны мужчын глядзяць скрозь пальцы, то вакол падобных персанажаў, як Хары Лахтэйн, раздуваюць скандал і пазбаўляюць пасады», — кажа Март Хельме.

Ён лічыць, што гэта сігнал для ўсяго дыпкорпуса. «Не думайце, што мы не ведаем, чым мы займаемся», — кажа дасведчаны дыпламат.

### За дзяржаву крыўдна

Зрэшты, некаторыя выданні ўсё ж не адмаўляюць след беларускіх спецслужбаў у гэтай справе. Тым не менш, яны дзівяцца, як такі дасведчаны чалавек мог дазваляць сабе такія вольнасці.

Аглядальнік сайта postimees.ee Рыста Берэндсан піша: «Для некаторых здаецца проста неверагодным, што Лахтэйн, які працаваў у сярэдзіне 90-х у Паліцыі бяспекі на кіраўнічай пасадзе, аказаўся ўцягнутым у настолькі пошлы скандал. Дыпламат, які мае за плячыма досвед працы ў контрразведцы, мусіў ведаць, што яго з'яўленне ў кампаніі маладых дзяўчат у двухсэнсоўных позах у разгар застолля кампраметуе».

### «За гэтым стаіць беларускі КДБ»

Павел Марозаў ад 2006 года жыве ў Таліне. У Беларусі супраць яго была заведзеная крымінальная справа па абразе Лукашэнкі. Марозаву ў віну ставіліся мульцікі пра кіраўніка дзяржавы. Эстонскія журналісты пацікавіліся ў яго стаўленнем да скандалу.

«За гэтым стаіць беларускі КДБ. Сэкс-скандал з эстонскім дыпламатам — гэта класічная правакацыя», — мяркуе П.Марозаў.

Характэрны загаловак быў змешчаны на сайце rus.delfi.ee. Партал піша: «Беларусь губіць прыбалтыйскіх дыпламатаў». У пацверджанне тэмы апісваецца гісторыя з супрацоўнікам латышскага пасольства, якога абвінавацілі ў распаўсюдзе парнаграфіі. Таямнічая смерць літоўца Вітаўтаса Пацюнаса: нібыта ён выпаў з акна гатэля ў п'яным выглядзе. У дадатак гісторыя з чэшскім дыпламатам Паўлам Крыжывагдавым.

Аднак усе папярэднія дыпламатычныя скандалы шырока афішаваліся ў беларускіх дзяржаўных СМІ, дэманстраваліся ўнікальныя кадры. Цяпер жа на тэлебачанні было поўнае маўчанне пра інцыдэнт. Гэта дало падставы для тэорый, што за скандалам стаіць не беларуская, а расійская спецслужбы. Яны мелі з Лахтэйнам рахункі пасля ягонай працы ў Грузіі. Акрамя таго, інцыдэнт мог мець на мэце пасеяць недавер між Беларуссю і Захадам.

### Ці была дзяўчына?

Тым не менш, ніякіх заяваў у беларускія праваахоўныя органы ад «пакрыўджанай мінчанкі» не было. Прэс-сакратар МЗС Андрэй Савіных кажа, што беларуская міліцыя не займаецца расследаваннем справы. Што прымушае задумацца, ці была дзяўчына?

Зрэшты, сам Лахтэйн не стаў апраўдвацца, што таксама накіроўвае на пэўныя думкі. Відаць, Лахтэйн не адчуваў сябе настолькі бязвінным, каб пачаць публічна бараніцца.

Варыянт дыскрэдытацыі з боку спецслужб усё адно з'яўляецца асноўным. Пакуль толькі няясныя матывы. Найбольш распаўсюджаная версія — дыпламат адмовіўся вербавацца. За што яму ўрэшце і адпомсцілі. Толькі хто?

**Зміцер Панкавец**

# Цыкл замкнуўся:

## Выйшаў апошні нумар «Сшыткаў гістарычных»

**Праца Гедройця можа стаць калі не прыкладам практычных крокаў, то маральным узорам для беларусаў.**
**Піша Алег Дзярновіч.**

Гэтым летам выйшаў з друку апошні, 171-ы нумар польскага часопіса «*Zeszyty Historyczne*» («*Сшыткі гістарычныя*»), які быў заснаваны ў 1962 г. у Парыжы, на эміграцыі, Ежы Гедройцем. Гэтае выданне канчаткова перайшло ў сферу легенд.

Пасля смерці Ежы Гедройця ў 2000 г. рэдактарскую справу працягнуў ягоны брат Генрык Марыя. Але ў канцы 2009 г. ён прыняў рашэнне пра заканчэнне 48-гадовай гісторыі «*Сшыткаў гістарычных*» ды звярнуўся да сталых аўтараў з просьбай даслаць тэксты для апошняга нумара часопіса. У сваіх лістах рэдактар пісаў:

«*У Польшчы без абмежаванняў развіваецца гістарычная навука, можна публікаваць усё, архівы даступныя. «Сшыткі гістарычныя» выканалі сваю ролю і маю надзею, што не паўстане болей ніколі сітуацыя, у якой зноў будзе патрэбным шукаць на эміграцыі прасторы свабоды для даследаванняў і публікацыяў.*

*Трэба зразумець, што рашэнне гэтае прынялі мы не без шкадавання і не без настальгіі...*

*Не хацелася б, каб гэты нумар стаў звышхвалебным — гэта было б чужым для заснавальніка часопіса. Мы таксама маем разуменне разнастайных памылак, дапушчаных на старонках нашага выдання. У развітальным нумары разлічваем на ацэнкі, вольныя ад актуальных падтэкстаў і асабістай палемікі*».

21 сакавіка 2010 г. у прадмесці Парыжа Мезон-Ляфіт, дзе месціцца заснаваны ягоным братам «*Інстытут Літарацкі*», пайшоў з гэтага свету і сам Генрык Марыя. Гістарычны цыкл набыў сваю завершанасць, а 171-ы нумар «*Сшыткаў гістарычных*» стаў эпітафіяй абодвум Гедройцям.

Мы ж маем не нагоду, а пакліканне хоць трохі распавесці як пра незвычайны лёс нашага суайчынніка Ежы Гедройця, так і пра інтэлектуальны феномен «*Сшыткаў гістарычных*».

### Маштаб Гедройця

Галоўны персанаж нашай гісторыі Ежы Гедройць нарадзіўся 27 ліпеня 1906 г. у Мінску. Увогуле, род Гедройцяў мае глыбокую і сімвалічную генеалогію — магчыма, гэты княскі род паходзіў з дынастыі, якая ўладарыла ў Літве яшчэ да Гедымінавічаў. Ужо ў XVI ст. род Гедройцяў моцна разгалінаваўся і некаторыя яго прадстаўнікі страцілі княскі тытул. Самы ж моцны ўдар па роду Гедройцяў быў нанесены ўжо ў XIX ст. — нашчадкі старажытнай ліцвінскай дынастыі ўзялі ўдзел у Напалеонаўскіх войнах і ва ўсіх паўстаннях на тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай. Як вынік — многія з Гедройцяў былі пазбаўленыя не толькі княскіх, але і шляхецкіх тытулаў, іхнія землі былі сканфіскаваныя, а самі яны высланыя ў Архангельск, Чыту ці Іркуцк. Пасля заканчэння ссылкі ім не дазвалялася вяртацца на Радзіму, а сем'і паўстанцаў заставаліся пад наглядам паліцыі.

Сам жа Ежы Гедройць належаў да княскай галіны гэтага старажытнага роду, што карысталася гербам «Гіпацэнтаўрус», але падчас свайго доўгага жыцця ён ніколі не афішаваў свайго паходжання. Да таго ж, Гедройці ўжо не мелі ранейшых багаццяў і зараблялі на жыццё не гаспадараннем у маёнтках, а з уласнае працы. Таму Ежы і нарадзіўся ў горадзе, у сям'і мінскага фармацэўта Ігната Гедройця.

Трэба адзначыць, што як толькі ў канцы XIX — пачатку XX стст. Расія стала крыху больш ліберальнай, Гедройці няпепска адаптаваліся ва ўмовах бюракратычнай сістэмы. Некаторыя з іх, асабліва жанчыны, маюць несумненныя заслугі перад расійскай культурай і навукай. Княжна Вера Гедройць (1870—1932) стала першай у Расіі жанчынай-хірургам і адной з першых у свеце жанчын-прафесараў хірургіі. Таксама Вера Гедройць была расійскім літаратарам — з 1910 г. яна выступала ў літаратурным друку з лірычнымі вершамі пад алонімам (іменем брата-нябожчыка) *Сяргей Гедройць*.



**Герб роду Гедройцяў «Гіпацэнтаўр» ці «Кітаўрас» — на срэбным полі выява кентаўра, які страляе з лука, замест хваста ў яго страла.**



**Ежы Гедройць у сваёй рэдакцыі ў Мэзон-Ляфіт пад Парыжам.**

Але на гэтым пранікненне Гедройцяў у расійскую літаратуру (яшчэ да Ежы) не скончылася. Недастаткова вядома, што аўтарам словаў папулярнай дзіцячай навагодняй песні «*Нарадзілася ялінка ў лесе*» («*В лесу родилась ёлочка*») Раіса Адамаўна Кудашава (1878—1964) — была ў дзявоцтве княжной Раісай Гедройць. У снежні 1903 г. у часопісе «*Малютка*» яна апублікавала свой верш «*Ялінка*». Зрэшты, княжна і сама не ведала, што ў 1905 г. гэтыя словы былі пакладзеныя на музыку. Толькі ў 1921 г. сціплая савецкая настаўніца і бібліятэкарка Раіса Кудашава зусім выпадкова пачула ў цягніку, як дзяўчынка спявае яе «*Ялінку*». У савецкія часы са старой спадчыны гэты дзіцячы шлягер быў адзіны дазволены на школьных «ранішніках».

### Ежы Гедройць

У тыя ж гады, пакуль яго крэўныя мусілі зжывацца з новай савецкай рэчаіснасцю, Ежы Гедройць атрымоўваў у Варшаве ўніверсітэцкую адукацыю — у 1920-х ён вывучаў права і гісторыю. У гэты ж час Ежы Гедройць звязаўся з лагерам младакансерватараў, блізкім да Юзафа Пілсудскага. У далейшым Гедройць ад ідэй федэралізму Пілсудскага, так і нерэалізаванага праз супраціў польскай правіцы, перайшоў да абсалютнага прызнання суверэнітэту народаў былой Рэчы Паспалітай, нават коштам саступак з боку Польшчы. У той жа перадваенны час Гедройць быў жанаты з расіянкай Таццянай Швяцовай.

Пачатак Другой сусветнай вайны заспеў яго чыноўнікам Міністэрства прамысловасці і гандлю. Далей былі эвакуацыя, праца ў структурах Польскага ўрада на выгнанні, бай ў Паўночнай Афрыцы і штабная служба ў арміі генерала Андэрса.

Для нашага ж сюжэта найбольш важным ёсць тое, што, як толькі стала магчымым, у 1946 г. Ежы Гедройць засноўвае ў Рыме «*Інстытут Літарацкі*», які ў 1947 г. быў перанесены ў Парыж, дзе і заставаўся ўжо надалей. Функцыі «*Інстытута Літарацкага*» складана акрэсліць нейкай адной дэфініцыяй. Найчасцей пішуць, што гэта было найбольш заслужанае польскае эміграцкае выдавецтва. Але «*Інстытут Літарацкі*» — гэта таксама архіў і асяродак культурных камунікацый. Менавіта «*Інстытут Літарацкі*» выдаваў штомесячнік «*Культура*», які стаў культурна-палітычным цэнтрам для польскай эміграцыі і аказваў уплыў на настрой думак у Польскай Народнай Рэспубліцы, куды нелегальна дастаўляўся.

Адным з праектаў «*Інстытута Літарацкага*» якраз і стаў квартальнік «*Сшыткі гістарычныя*», які публікаваў матэрыялы, прысвечаныя галоўным чынам найноўшай гісторыі Польшчы і суседніх з ёй краінаў — Украіны, Літвы, Беларусі, Латвіі, а таксама Расіі. Былі гэта публікацыі дакументаў, успамінаў, навуковай і публіцыстычнай палемікі, карэспандэнцыі. У часы ПНР некаторыя польскія аўтары мелі магчымасць друкавацца ў «*Сшытках гістарычных*» пад псеўданімамі, пазбягаючы гэтым самым умяшання ў свае тэксты камуністычнай цэнзуры.

### Грамадзянская візія «Сшыткаў гістарычных»

За перыяд у 48 гадоў на старонках квартальніка з'явілася вялікая колькасць інфармацыйных і палемічных матэрыялаў. Важна адзначыць, што выдаўцы і многія сталыя аўтары «*Сшыткаў гістарычных*» мелі выразнае бачанне місіі выдання і тых прынцыпаў, якімі яны кіраваліся ў сваёй творчасці і працы.

Унутрыэміграцыйныя спрэчкі і міжасабовыя праблемы найменш цікавілі Гедройця і ягоных калег. Але цікавіла іх стаўленне эміграцыі да «краю» — так яны называлі краіну-Польшчу — і наадварот. Яны лічылі, што *эміграцыя мусіць верна служыць краю, а не край эміграцыі*. Нацыянальны ж лёс вырашаецца ў краі, а не на эміграцыі, хай сабе краіна і занятая саветамі, хай сабе ўлада там «не наша».

Інтэлектуальны асяродак, што ўтварыўся вакол «Культуры» і «Сшыткаў гістарычных», быў перакананы, што пасля Сусветнай вайны *да незалежнасці трэба ісці іншай, не паўстанцкай дарогай*. І гэта так кантраставала з прадчуваннямі і захадамі беларускай, украінскай, балтыйскай і часткова польскай эміграцыі, якая марна пакладала столькі высілкаў і людзей у чаканні будучага глабальнага ваеннага канфлікту.

Апроч таго, Ежы Гедройць вельмі ясна і адкрыта казаў, што вяртання да мінулых часоў няма і быць не можа, а *палякі мусяць пагадзіцца са стратаю Вільні, Гродна і Львова — на карысць канчатковага паразумення і паяднання з літоўцамі, беларусамі і ўкраінцамі*. А без гэтага паяднання лёс Польшчы і ў далейшай перспектыве будзе пад пагрозай. Безумоўна, такая тэза выклікала проста раздражненне ў польскай эміграцыі.

Адначасова рэдактар «Сшыткаў гістарычных» меркаваў, што для лёсу Польшчы і памежных з ёй краін *вырашальнае значэнне будуць мець змены ў Расіі і ва ўсім савецкім блоку*. Як паказала далейшая гісторыя, без такіх зменаў здабыццё Польшчай незалежнасці было б немагчымым. А разліку эміграцыі, што вызваленне прыйдзе з Захаду, было ілюзійным. Сам жа Гедройць, у меру сваіх магчымасцяў, усяляк спрыяў і падтрымліваў змены ў Расіі. Гедройць меў ясную свядомасць маштабу і закаранеласці праблемы, але, адкідаючы псіхалагічна зразумелую русафобію польскай эміграцыі, імкнуўся ісці насустрач расійскаму грамадству.

Рэдактар «Культуры» вельмі добра разумеў, што «Ялцінскі парадак» быў чымсьці адным для паняволеных савецкай імперыяй народаў, а чымсьці іншым — для Захаду. Для Цэнтральнай і Усходняй Еўропы гэтая сістэма была ўвасабленнем несвабоды. У той жа час для Захаду яна была зарукай суверэнітэту і стабільнасці, з чаго вынікаў таксама палітычны і гаспадарчы росквіт. У такой сітуацыі для дасягнення мэтаў ад прадстаўнікоў народаў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы патрабаваўся зусім не авантурызм, а паслядоўная і карпатлівая праца. Ежы Гедройць быў для яе гатовы.

Адстойванне сваёй пазіцыі, пошук магчымасцяў для рэалізацыі выдавецкіх праектаў вымагалі ад Ежы Гедройця грамадзянскай адвагі, самаахвярнасці, настойлівасці і, як прыгадвалі сучаснікі, «ліцвінскай упартасці».

### «Вялікі жэст»

Але ўся прагматыка і, як маглі б ацаніць некаторыя, няўжыўчывасць Ежы Гедройця не могуць цалкам ахарактарызаваць постаць гэтага чалавека. Адзін эпізод з ягонай біяграфіі, мяркую, дадае зусім нязвыклыя рысы не столькі да характару будучага Рэдактара, але да яго гістарыясофскай канцэпцыі, да бачання маральна-псіхалагічных механізмаў увасаблення палітычнай мэты.

Ежы Гедройць несумненна валодаў крытычным розумам і яшчэ ў 1944 г. вельмі крытычна паставіўся да ідэі Варшаўскага паўстання — узброеная выступленне супраць акупантаў Варшавы, якое ўспыхнула 1 жніўня 1944 г. і працягвалася да 3 кастрычніка таго ж года. З боку ваеннага паўстанне было скіраванае супраць нямецкіх войск. Але ж стратэгічнай мэтай акцыі было ратаванне пасляваеннага суверэнітэту, даваенный усходняй мяжы, утварэнне ў сталіцы легальнай польскай улады, якая б была натуральна паслядоўніцай улады даваеннай. Як вядома, Іосіф Сталін спыніў Чырвоную Армію перад Віслай і даў немцам задушыць паўстанне.

Гедройць жа лічыў, што ў пэўных пераломных момантах гісторыі здзяйсненне «вялікіх жэстаў» на карысць будучыні ёсць патрабаваннем моманту. Таму ў жніўні 1944 г. ён імкнуўся пераканаць генерала Казіміра Саснкоўскага, Вярхоўнага галоўнакамандуючага Польскіх узброеных сіл, супольна дэсантавацца ў палаючую Варшаву. Першапачаткова генерал пагадзіўся на гэты адчайны крок і запэўніў прэзідэнта Уладзіслава Рачкевіча, што стане там на чале Арміі Краёвай. Але пазней гэтага не зрабіў, насупраць настойлівасці Ежы Гедройця.

Дэсантаваўшыся ў Варшаву, якая відавочна гінула, генерал Саснкоўскі стаў бы другім Юзафам Панятоўскім — сімвалічнай для палякаў фігурай і часткаю гістарычнай легенды, якая б пазней праз дзесяцігоддзі ўплывала б на нацыянальнае жыццё.

Але генерал Саснкоўскі не зрабіў гэтага і ўвайшоў у гісторыю як чалавек, разадраны ўнутрана. У адказны момант ён не здолеў забараніць пачатак паўстання, супраць якога ён быў, але не змог і далучыцца да яго ды стаць на чале суайчыннікаў, якія гінулі за незалежнасць сваёй Радзімы. Ежы Гедройць спрабаваў пераканаць генерала здзейсніць гэты ўчынак, калі зразумеў, што ў 1944 г. рахунак выстаўляўся на будучыя легенды.

### У пошуках адказаў

Ці апраўдана для нас, распавядаючы пра лёс Ежы Гедройця і ягоных выданняў, увесь час трапляць на паралелі сучаснай беларускай сітуацыі і дзейнасць паваеннай польскай эміграцыі? Паралелі гэтыя не сітуацыйныя, але сутнасныя. Са спазненнем на дзве-тры генерацыі Беларусь праходзіць праз працэсы, якія мусілі перажыць палякі. Адказы на выклікі гістарычнага моманту могуць быць у рознай ступені разважлівыя і паспяховыя. Досвед працы нашага суайчынніка, нашчадка гістарычнай ліцвінскай традыцыі і польскага інтэлектуала, можа стаць калі не прыкладам практычных крокаў, то маральным узорам для псіхалагічна расцярушанай беларускай свядомасці.

# Палітычны Багдановіч

Пра малавядомы твор Максіма Багдановіча піша **Арсень Ліс**.

Творчасць Максіма Багдановіча, асабліва двух апошніх гадоў жыцця паэта, выразна адзначаная сталым трывожным роздумам над лёсам Беларусі. Не было ў тым нічога выпадковага — яны прыпалі якраз на час Першай сусветнай вайны з яе нялічанымі ахвярамі, непрадказальнымі наступствамі. У гэты перыяд Беларусь, і ў тым, пэўна, яе гістарычная наканаванасць, на гады трапіла ў эпіцэнтр мілітарнага супрацьстаяння вялікіх дзяржаваў, затым у чараду акупацый, інтэрвенцый, сталася аб'ектам тактычных і стратэгічных планаў яе суседзяў.

З ініцыятывы інтэлігенцыі, пакліканы непасрэдна Аркадзем Смолічам, пазней знаным беларускім палітыкам, навукоўцам, восенню 1916 года Максім Багдановіч прыехаў у фактычна прыфрантавы Мінск. Паэт на ўласныя вочы ўбачыў, мог адчуць, у якую бяду-нядолю быў кінуты вайною яго народ. Праз горад няспынна цёк бясконцы паток бежанцаў. Уся Гродзеншчына і Віленшчына былі зрушаныя з месца, жыхарства іх ператварылася ў выгнанцаў, вымушаных уцекачоў. Гнаны валам франтоў на сялянскіх скрыпучых вазах, з дзецьмі, старымі, сціплым скарбам люд знябожана цягнуўся на Усход.

Уладкаваны сябрамі на службу ў Камітэт помачы ахвярам вайны, у штаце якога працавала гронка грамадзянска актыўнай беларускай інтэлігенцыі,



Не сваю — чужую долю баранілі,
Пад чужымі сцягамі ўміралі.

Максім Багдановіч меў магчымасць уведаць фактычны, рэальны стан рэчаў з бежанствам як народным бедствам, грамадска-палітычнымі настроямі ў краі.

Паэт стаў жаданым госцем на імправізаваных вечарынах у народным клубе «Беларуская хатка». На адной з такіх вечарын, як успамінала іх удзельніца Апалінарыя Радкевіч, па просьбе-прадстаўленні А. Смоліча адбылася прэм'ера славутай «Пагоні». Зыходны трывожна-валявы зачын-матыў «Толькі ў сэрцы трывожным пачую за краіну радзімую жах...» паэт перватварыў у магутнае мастацкае сцверджанне беларускай нацыянальнай ідэі, яе непераможнасці. Роздум Максіма Багдановіча аб гістарычных шляхах Беларусі, яе будучыні, натуральна, набіраў розныя змест і форму выказвання ў слове.

У адных творах паэт катэгарычны, гарачлівы ў асуджэнні нечага істотнага ў беларускай мінуўшчыне, можна сказаць, у беларускім менталітэце:

Досі ўжо, браты, чужынцам мы служылі,
Досі ўжо пашаны ім прыдбалі;
Не сваю — чужую долю баранілі,
Пад чужымі сцягамі ўміралі.

У вершы ж «Беларусь, Беларусь! Агнём імя тваё мне гарыць», прынамсі, у першай яго страфе адчуваецца прысутнасць у аўтара апанента, бо інакш адкуль у наступных радках імя радзімы-Беларусі?

Страшным агнём у размове стаіць
І грымотаю ў гнеў раздаецца.

Адчуваецца ўнутраная палеміка паэта з царскім афіцыёзам, паводле якога, з падачы расійскай дваранскай гістарыяграфіі ды адыёзна дзейных на пачатку XX ст. чарнасоценцаў, беларускі і ўкраінскі этнасы — несамастойныя. Ды што казаць пра 1900-я і 10-я гады XX ст. Рэха іх пустым глумлівым зыкам адгукаецца і сёння, на пачатку стагоддзя XXI.

Беларускаму паэту гэта абыходзіла, балела. Прыведзеныя вышэй радкі некалі даўнымдаўно мне трапіліся на вочы ў старым беларускім календары за 1927 год. Такія кнігі-календары ў 1920—30-я гады выдаваліся ў Вільні і былі вельмі папулярныя ў Заходняй Беларусі.

Публікацыя Багдановічавага верша суправаджалася кароткай заўвагай: «Друкуецца як малазнаны твор». Ніякага каментара, спасылкі на крыніцу. Аднак у тым, што твор належыць пяру Максіма Багдановіча, сумнявацца не даводзіцца. У рэчы незакончанай, слабай кампазіцыйнай знітаванасцю строф, жыве яго, паэтава душа. І ход аўтарскай думкі пазначаны, бачны.

Запомнілася, можна сказаць, запала ў памяць перадусім другая, апошняя страфа. Зноў яго думка пра Беларусь. Гэтым разам па асацыяцыі:

Як нявехна[*] ў няроўнай сям'і
Ты пасагу сабе не надбала,
Залатыя кляйноты[**] твае
Ў пыху[***] сёстрам сваім даравала.

Аўтар даследчыцкай працы «Белорусское возрождение», М.Багдановіч пра залатыя кляйноты, падораныя сёстрам, думаў, казаў у кантэксце палемікі з праціўнікамі нацыянальнага адраджэння беларусаў. Што да верша-накіду, пра які тут гаворка, то яго, на жаль, не сустрэць ні ў двухтомніку 1960-х гадоў, ні ў самым поўным трохтомным акадэмічным выданні паэтавай спадчыны. Але згаданае, да слова, — толькі інфармацыя для будучых, магчымых выданняў.

Што ж да роздуму Максіма Багдановіча ў апошні год яго жыцця над мінулым і сучасным Беларусі, то, без сумневу, паэтам пераадольваўся мінор і наўпрост выказвалася вера ў яе добрую будучыню:

Беларусь, твой народ дачакаецца
Залацістага яснага дня...

Адзін з апошніх твораў паэта, запаветны, гучыць пабуджальна, кліча да дзеяння. І як на час напісання — актуальны:

Ты не згаснеш, ясная заранaчка,
Ты яшчэ асвеціш родны край.
Беларусь мая! Краіна-бранaчка!
Устань, свабодны шлях сабе шукай.

[*] Нявехна — нявестка (дыялектавае).
[**] Кляйноты — каштоўнасці.
[***] У пыху — дзеля задавальнення амбіцый.

# «Каласы пад сярпом тваім» здымуць па-беларуску

Але хто і калі?

Аб планах «Беларусьфільма» зняць кіно паводле рамана Уладзіміра Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім» стала вядома ў лютым. Мінула паўгода, а на кінастудыі здолелі толькі напісаць сцэнар для стужкі.

За яго ўзяўся Аляксандр Качан. Працу ён завяршыў і атрымаў за яе ганарар. Але, як паведаміла прэс-сакратар кінастудыі Валянціна Белякова, сцэнар Качана папрасілі дапрацаваць. Якія былі заўвагі? «Справа не ідзе аб патрабаваннях кінастудыі. Гэта быў мае ўласныя праблемы», — кажа Аляксандр.

Немалаважнае пытанне і з моваю, на якой загавораць героі караткевічаўскай дылогіі. «Пераважная большасць размоў у фільме мусіць быць па-беларуску. Але ўжываецца таксама расійская, польская і французская».

Вызначыліся былі і з рэжысёрам. Запрасілі Мікалая Пінігіна. Але ў маі галоўны рэжысёр Купалаўскага тэатра адмовіўся ад працы. Замены яму не знайшлі. На «Беларусьфільме» пакуль не гатовыя гаварыць і аб іншых кандыдатурах на гэтую працу. Качан мяркуе, што «наконт Пінігіна пытанне яшчэ не закрытае. Магчыма, ён зможа заняцца гэтым праектам трохі пазней». Мо з гэтай прычыны на кінастудыі і марудзяць.

У Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі ўжо два гады ідзе спектакль паводле «Каласоў пад сярпом тваім». Яго паставіў Валерый Анісенка. Калі ён даведаўся, што будзе здымацца фільм, падаў заяўку на кінастудыю як сцэнарыст і рэжысёр. Але яе адхілілі.

А пакуль няма рэжысёра, то і пра акцёраў гаварыць заўчасна. Таму загадкай застаецца, хто ж сыграе пана Юрыя, Алеся Загорскага, Майку.

**Сяргей Макарэвіч**

КАЛЯНДАР

## Верасень

**8** — Дзень беларускай вайсковай славы. У гэты дзень у 1514 г. пад Оршай войскі ВКЛ на чале з гетманам Канстанцінам Астрожскім разграмілі ўтрая большае войска маскоўскіх захопнікаў.

**9** — Канец Рамадана ў мусульманаў.

**9** — Рош Ашонэ (Новы год) у юдэяў.

**14** — 625 гадоў таму (1385) адбылося падпісанне Крэўскай уніі, саюзніцкай дамовы паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Польскім каралеўствам.

**21** — Міжнародны дзень міру.

**27** — Управаслаўных – свята Узвіжання Святога і Жыватворнага Крыжа Гасподняга.

**28** — Міжнародны дзень глухіх.

**30** — Міжнародны дзень перакладчыка.

**Склаў ЛК**

ПАДЗЯКА ПРАЗ ГАЗЕТУ

## Дзякуй Яраславу Берніковічу

«Газета, якая працуе!» — чытаю буклет Глыбоцкай рэкламнай газеты «Прэфект-інфо», — і далей: «Мы дапаможам зрабіць ваш бізнес квітнеючым». Бізнес? А ў мяне душа стала квітнеючай.

Рэдакцыя гэтай рэкламнай газеты «Прэфект-інфо» ўзняла мяне на крылы. Яна выпусціла ў свет кнігі паэзіі «На вас глядзіць мая душа» і «Зорка гасцюе ў месяца».

Такая светла-ідэйная дзея выдаўца газеты Яраслава Берніковіча.

Зміцер Лупач старанна звярстаў кнігі. Фотаздымкі Марыі Новікавай упісаліся ў мастацкую задумку (Цімурам Берніковічам) вокладкі.

Люба дакрануцца да кнігі, бліскучай, выяўнай.

Я з кніжкамі цяпер — як німфа.
Хай будзе моцнай «Прэфект-інфо»!

**Марыя Баравік,**
**Падсвілле**
**(Глыбоцкі раён)**

## Сцісла

**• Вызначаны хіт сезона.** Цягам месяца на музычным інтэрнэт-партале «Тузін Гітоў» праходзіў выбар самых годных беларускамоўных твораў. У прэтэндэнтах было 72 кампазіцыі выканаўцаў абсалютна розных жанраў, якія ўдзельнічалі ў хіт-парадзе цягам музычнага сезона 2009—2010. Шляхам галасавання слухачоў перамогу атрымаў гурт «Глюкі» з песняй «Краіна 2.0», запісанай пры ўдзеле гуртоў MAUZER і Green Che. На другім месцы — гурт «Дзецідзяцей» з песняй «Раптам».

**• Беларусь возьме ўдзел у 54-й Венецыянскай біенале.** Сусветны форум выяўленчага мастацтва пройдзе з чэрвеня па лістапад 2011 года. Беларуская дэлегацыя ўжо наведала Венецыю, каб выбраць памяшканне: не больш за 300 квадратных метраў. І арэнду гэтай плошчы аплаціць «Прыёрбанк». Перад тым, як ехаць на біенале, экспазіцыя беларускага нацыянальнага павільёна будзе выстаўленая ў Мінску.

**• Расце цікавасць да нацыянальнага вясельнага абраду.** Аб гэтым заявіла дырэктарка Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту Святлана Лакатко. Упершыню паслугу «беларускае вяселле» музей прапанаваў у 2005 годзе. З кожным годам колькасць ахвотнікаў выканаць нацыянальны вясельны абрад расце. Нават утварылася чарга.

**• У Берліне знікне арт-цэнтр «Тахелес».** Яго будынак ужо выстаўлены на продаж. Улады Берліна не могуць больш фінансаваць існаванне арт-цэнтра. Шматлікія мастакі і музыкі жывуць у ім, там жа праводзяцца канцэрты. Сярод мастакоў, што працуюць у «Тахелесе», — і беларускі мастак Аляксандр Родзін. Разам з арт-цэнтрам Берлін страціць такое ж па значнасці славутае месца, як, напрыклад, Берлінская сцяна.

**КМ**

# «У гасцях у кандыдата»: Віталь Рымашэўскі



Піша **Настасся Зелянкова**. Фота **Юліі Дарашкевіч**.

Чарговай ахвярай супольнага праекта фатографа «Нашай нівы» Юліі Дарашкевіч і карэспандэнта «Салідарнасці» Анастасіі Зелянковай «У гасцях у кандыдата» стаў Віталь Рымашэўскі. Выпраўляючыся да яго, мы, шчыра кажучы, нерваваліся: а раптам не зможам адпавядаць маральнаму абліччу кандыдата ад хрысціянскіх дэмакратаў? Яго жытло ўяўлялася нам ну калі не келляй манаха, то ўжо напэўна сціплым малельным дамком з рэлігійнай літаратурай, шматлікімі іконамі і пахам ладану. Мы памыляліся.

### Ідэальны сем'янін

Аднапакаёвая кватэра ў Сухараве нагадвала манаскае жытло хіба што сваімі сціплымі памерамі.

— У нас тут трохі цеснавата, так што праходзьце адразу ў залу, — гасцінна запрасіў нас Віталь.

Мы паслухаліся.

— Знаёмцеся, мая сям'я: жонка Насця і дачка Ева, — прадставіў нам кандыдат сімпатычную жычыну з дзіцем на руках.

Аднагадовая малеча расплылася ў бяззубай усмешцы, убачыўшы незнаёмых цётачак. Паддаўшыся мацярынскаму інстынкту, мы нешта прасюсюкалі ёй у адказ.

Высветлілася, што імя дачцэ кандыдат падбіраў сам. Праўда, спачатку ў сям'і меркавалася, што будзе хлопчык.

— Віталік ужо збіраўся назваць яго Адамам. У гонар Адама Станкевіча, — расказала Насця. — А тут на табе — дзяўчынка!

І ўсё ж Евай дачку Віталь ахрысціў не ў гонар прамаці, а ў гонар сваёй стрыечнай бабулі.

Гэта не адзіны сюрпрыз, які падрыхтавала дачушка свайму бацьку.

— Вось усяго чакаў, але што дачка будзе рудой, нават падумаць не мог! Я светлы, жонка цёмная... Хоць быў у мяне ў родзе хтосьці рудаваласы, — паспрабаваў развеяць усе нашы сумневы Віталь.

Хаця, гледзячы на дзіцячыя фатаграфіі Рымашэўскага, ніхто і не думае сумнявацца ў яго бацькоўстве.

Па ўсім было відаць, што дачку Віталь усім сэрцам любіць. З-за мяжы абавязкова штонебудзь ёй прывозіць. Ложак, коўдрачка, шматлікія цацкі пераваандравалі сюды з крамаў Манхэтэна, Бостана, Берліна.

Ева ж у знак падзякі выселіла тату на кухню — менавіта там у кандыдата цяпер працоўны кабінет.

— Кватэра сапраўды маленькая. Можа, пасля прэзідэнцкіх выбараў падумаем пра пашырэнне, — смяецца Рымашэўскі.

— Ну, там ужо пра жыллё і думаць не трэба будзе, — паспрабавалі мы ўсяліць надзею ў кандыдата. — Дарэчы, а жонка ўжо гатовая ўзяць на сябе функцыі першай лэдзі?

— Вядома, — не задумваючыся, адказаў за жонку Віталь. — Яна ў мяне крыху сарамлівая, але, думаю, дамо рады. Мне здаецца, гэта правільна, калі жонка побач са сваім мужам, суправаджае яго ва ўсіх паездках. І дачка, калі я стану прэзідэнтам, будзе ўвесь час са мной. Хаця не. Дачку на афіцыйныя мерапрыемствы я браць не буду. Хопіць нам аднаго сына.

Дарэчы, Віталь і Насця жанатыя восем гадоў. А знаёмыя нават больш.

— Толькі спадабаліся адно аднаму не адразу, — прызнаецца Насця. — Іскра прабегла пазней. Нават не магу сказаць, у які дакладна момант. Паглядзеў ён на мяне неяк асабліва.

— А як вы паставіліся да таго, што жанчыны назвалі вашага мужа самым сэксуальным кандыдатам? — паспрабавалі мы выклікаць жаночую рэўнасць.

— Ну, так і павінна было быць! — апярэдзіў з адказам жонку Рымашэўскі.

Мы пераглянуліся і ўжо было хацелі падзівіцца такой нясціплaсці патэнцыйнага кандыдата, але Віталь тут жа растлумачыў:

— Я ж самы малады з усіх. Пасля Міхалевіча. Таму шанцы ў нас і ў астатніх былі няроўныя. Вось я і перамог.

У прысутнасці жонкі мы не рызыкнулі пераконваць Рымашэўскага ў адваротным.

### Нішто чалавечае

Чым даўжэй мы размаўлялі, тым мацнейшае ў нас узнікала адчуванне, што ідэальнейшага мужа і бацькі пажадаць немагчыма: і вопратку жонцы за мяжой купляе, і кветкі рэгулярна дорыць, і сняданкі робіць.



Імя дачцэ Еве кандыдат падбіраў сам.



На балконе мы знайшлі парачку гіраў.



Працоўны кабінет у Віталя — на кухні.



На падлозе — пакладзены ўласнаручна лінолеум.



Жонка Насця.





Ложак, коўдрачка, шматлікія цацкі перавандравалі сюды з крамаў Манхэтэна, Бостана, Берліна.

На падлозе — пакладзены ўласнаручна лінолеум, на падваконні — асабіста вырашчаны гранат. Увогуле, казка, а не муж. І гэта мы яшчэ прэзідэнцкія якасці не вывучалі!

— Дык што, няўжо наогул няма шкодных звычак? — усё не верылі мы.

— Гледзячы, што лічыць шкоднай звычкай, — азваўся Віталь. — Я вось, напрыклад, не магу цалкам адмовіцца ад тэлевізара і лічу гэта шкоднай звычкай.

Праўда, як высветлілася, глядзіць Рымашэўскі выключна навіны і канал Animal Planet. Вось ужо сапраўды грэшнік!

— Гэта значыць, ніколі не піў, не курыў? — ужо практычна страцілі мы надзею.

— Ну чаму ж, — азваўся Рымашэўскі, да нашай вялікай радасці. — У маладосці я паспрабаваў усё. Шмат за што сёння нават сорамна. Курыць кінуў гадоў дзесяць таму. Піць? Дык я і цяпер магу выпіць. З алкагольных напояў аддаю перавагу віскі.

Праўда, па словах Рымашэўскага, набрацца ў бэлю ўжо даўно не ўдаецца. Хаця ён, мяркуючы па ўсім, і не асабліва імкнецца. Мы папрасілі дазволу сфатаграфаваць бар кандыдата.

— Дык які там бар? Так... Стаіць бутэлька «Бехераўкі» сярод слоікаў з крупамі, — панаракаў Рымашэўскі.

Аднак нам было важна займець хаця б гэты «кампрамат». Але Віталь аказаўся цвёрдым.

— Не, усё ж здымаць не варта. Сябры могуць не зразумець.

## Віталь Рымашэўскі: «У маладосці паспрабаваў усё».

Давялося падпарадкавацца. Хоць без дакументальнага пацверджання, мы разумелі, заўсёды можна спісаць на інтрыгі «нячэсных» журналістаў.

Аднак мы не гублялі надзеі і працягвалі распытваць кандыдата пра бурную маладосць. Так мы даведаліся і пра першы прывод Рымашэўскага ў міліцыю. Прычым палітыкай тады і не пахла. Банальная «хуліганка».

— Ды гарэзілі па маладосці. Яшчэ ў студэнцкія гады, — махнуў рукой Рымашэўскі. — Апранулі аднаго нашага таварыша ў фуфайку, заклеілі яму рот. Спераду прымацавалі таблічку «Партызан», а ззаду напісалі: «Сам дурань». І пайшлі з ім па вагонах метро. Усе людзі нармальна рэагавалі, смяяліся. А адзін пасажыр — хоць і быў тады ў цывільным — аказаўся без пачуцця гумару. Пакуль бачыў нашага таварыша спераду, усміхаўся, а калі надпіс на спіне прачытаў — чамусьці пакрыўдзіўся.

Так кампанія загрымела ў міліцыю. На шчасце, абышлося без складання пратаколаў. Адзначыўся Рымашэўскі і іншымі супрацьзаконнымі выбрыкамі. Але аб тым, як будучы кандыдат вывешваў сцяг ва ўніверсітэце, нам ужо было не асабліва цікава.

— Напэўна, калі б не рэлігія, зрабіўся б бандытам. Для мяне заўсёды грамадскія правілы не былі законам, — парадаваў нас чарговым адкрыццём кандыдат.

Дарэчы, усе перадумовы для гэтага ў Рымашэўскага былі. У дзяцінстве ён займаўся самба і боксам, цягаў гіры. Карацей, быў моцным хлопцам. На жаль, баксёрскія пальчаткі нядаўна перавандравалі да бацькоў на лецішча. Але вось парачка гіраў на балконе заваялася і цалкам магла забяспечыць нам выдатную кампазіцыю для здымка.

— Ну што, пілаваць будзем або падымаць? — падбухторвалі мы Віталя.

Гіры ўрачыста былі прынесеныя з балкона, пыл з іх стрэсены. І — ура! — магутная рука кандыдата ўзняла іх над галавой.

Пакуль Рымашэўскі падымаў гіры, мы заўважылі на яго запясці зіхоткі гадзіннік.

— Няўжо швейцарскі?

— Так. Заўсёды хацеў менавіта швейцарскі. І вось нядаўна купіў. Можа, ён не вельмі круты. Затое сапраўдны.

Мы яшчэ крыху пабалбаталі пра палітыку, рэлігію — ну пра што яшчэ пагаварыць дзвюм сімпатычным дзяўчатам з маладым сімпатычным мужчынам? Абмеркавалі Манэ, рэпрадукцыі якога былі развешаныя па сценах кватэры (жонка Рымашэўскага па адукацыі культуролаг). Калі ж цікавасць кандыдата да яго швейцарскага гадзінніка зрабілася больш пільнай, мы вырашылі, што трэба і меру ведаць.

— Проста хочам яшчэ на вячэрнюю паспець, — апраўдваўся Рымашэўскі.

Мы не сталі злоўжываць гасціннасцю.

Выходзілі ўсе разам. Ева звыкла боўталася ў сумцы-кенгуру на жываце бацькі.

— Ну што, заходзьце цяпер у госці проста так. Без фотакамер, — гасцінна запрасіў нас Віталь.

А што толку? Без фота ўсё роўна ніхто не паверыць.





Вазонаў у хаце хрысціянскага дэмакрата куды больш, чым іконаў.






# Камяніца

Фолк-фэст «Камяніца» адбудзецца 4 верасня ў Музеі народнай архітэктуры і побыту. Акрамя хэдлайнераў, «Тройцы» і «Палаца», у Строчыцах выступяць гурты «Маланка Аркестр», Akana, «Бан-Жвірба» і Guda. Акрамя гэтага, плануюцца выступы маладых калектываў, а таксама народныя гульні і забавы. «Мы хочам паказаць розныя бакі сучаснай беларускай фолк-культуры, таму на фэсце будуць не толькі архаічныя спевы і туга, але і сучасныя эксперыменты і шмат пазітыву, — распавядае каардынатар фэсту Сяргей Чагрынец. — Таксама наведвальнікі будуць мець магчымасць агледзець усю экспазіцыю музея і проста добра пашпацыраваць сярод лугоў і аўтэнтычных драўляных забудоў XVIII—XX стст.». У гэтым годзе фэст таксама распачынае традыцыю запрашэння адмысловых гасцей. Вядомыя выканаўцы з іншых музычных напрамкаў будуць у межах фэсту спяваць народныя песні. Першы з іх — рок-музыка Лявон Вольскі. «Запрашэнне было досыць нечаканым, але тым больш цікавым, — прызнаецца Вольскі. — Будзем прэзентаваць невялікую адмысловую праграму з акустычнымі інструментамі. Спадзяюся, што фолк-дзеячы не раскрытыкуюць нашага эксперымента».

Дарэчы, даехаць сёлета да фэсту будзе значна прасцей. Ад прыпынку «Малінаўка-6» (скрыжаванне вуліц Громава і Слабадской) да музея і ад яго з 13 да 22 гадзін будзе ездзіць бясплатнае маршрутнае таксі. Акрамя таго, можна будзе даехаць ад аўтастанцыі «Паўднёва-Заходняя» аўтобусам №203, які ў гэты дзень будзе хадзіць часцей і пазней, чым звычайна.

Фэст працягнецца ад 15- да 22-й.

**ЮМ**

## ІМПРЭЗЫ

### 1 верасня ў Музеі

**Нацыянальны гістарычны музей спецыяльна да пачатку новага навучальнага года 1 верасня** дазваляе бясплатны ўваход на сваю экспазіцыю для ўсіх школьнікаў. Акцыя не распаўсюджваецца на выставу «Гіганты Ледавіковага перыяду».

### Рок па вакацыях

**11 верасня ад 18-й да 22-й у клубе «Рэактар» (вул.Харужай, 29)** адбудзецца фестываль «Рок па вакацыях». Бяруць удзел: **«Без білета»**, **«Нейрадзюбель»**, **«Крама»**, **«Drum Ecstasy»**, **«The Toobes»**, **«У Нескладовае»**, **«ZM99»**.

### Сучасная шведская харэаграфія

**У Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі (Мінск) 7 і 8 верасня і ў Гродзенскім абласным драматычным тэатры 5 верасня а 19-й** — вечары шведскай харэаграфіі. Можна будзе ўбачыць пастаноўкі Сібрыг Доктэр «Там, дзе вада цячэ ўгару» і «Але я не...» Бено Воархама.

### Аршанская бітва

Прымеркаваны да бітвы пад Оршай фестываль бардаўскай песні адбудзецца **11 верасня**. У фэсце возьмуць удзел **Андрэй Мельнікаў** і малады бард **Ната Пушкарова**. Бардаўскі фэст «Аршанская бітва» ладзіцца штогод на Крапівенскім полі пад Оршай. Ён прымеркаваны да Дня беларускай вайсковай славы — перамогі войска Вялікага Княства Літоўскага над войскамі Маскоўскага княства 8 верасня 1514 года. **Фэст адбываецца на месцы Аршанскае бітвы 1514 г. — правым беразе Дняпра, дзе ў яго ўліваецца рэчка Крапівенка.** Ён доўжыцца ўсю ноч, каб за нядзелю ўдзельнікі змаглі адпачыць і спакойна дабрацца дадому. Фэст праходзіць на адкрытым паветры ля ракі, варта падумаць пра цёплую вопратку, ежу і намёт. Дровы для вогнішча будуць на месцы.

### Аксамітны сезон — 2010

**3—4 верасня** — міжнародны фэст пад адкрытым небам «Аксамітны сезон — 2010». Двухдзённы міжнародны фестываль пройдзе ў 18 км ад Мінска ў парку прыгодаў «Крутагор'е». У праграме выступы гуртоў з Аўстрыі, Украіны, Германіі і Беларусі, на двух сцэнах пройдзе фестываль беларускай актуальнай музыкі «Можна!», запланаваныя шэраг майстар-класаў, паказальных выступаў і гульняў. Пачнецца «Аксамітны сёзон–2010» **3 верасня а 17-й.** Дастаўка маршрутным таксі ад ст. метро «Каменная горка».

### Амерыка ў Мінску!

Прэзентацыя беларускага перакладу рамана Курта Вонэгута «Бойня №5, або Крыжовы паход дзетак» адбудзецца **8 верасня (серада) у кнігарні «Ў» (Незалежнасці, 37а)**. Сваім думкамі пра амерыканскую літаратуру і творамі пра Амерыку падзеляцца Уладзімір Арлоў, Андрэй Хадановіч, Віталь Рыжкоў, Сяржук Мядзведзеў, а таксама перакладчык рамана Павал Касцюкевіч. **Пачатак а 18-й.** Уваход — вольны.

### Кубак піва — 2010

**4 і 5 верасня ў ГСАК «Лагойск»** пройдзе піўны фэст «Кубак піва–2010». У праграме спаборніцтва паміж наведвальнікамі і прадстаўнікамі кампаній–вытворцаў піва, кірмаш піва, канцэртная праграма. 4 верасня з 14–й ад ст.м. «Усход» будуць курсіраваць аўтобусы.

### Дзень пісьменства-2010

**адбудзецца 5 верасня ў Хойніках**. Па традыцыі, **урачыстасці пачнуцца са службы ў Саборы Перамянення Гасподняга а 9.00**. Затым пачнуцца канцэртныя праграмы. У парку адчыняць комплекс «Сядзібны дом», у якім разгорнецца экспазіцыя краязнаўчага музея. Пройдуць выставы кніг дзяржаўных выдавецтваў і сустрэчы з пісьменнікамі з афіцыйнага Саюза. Хойнічччына — радзіма Івана Мележа.

## КАНЦЭРТЫ

### Apple Tea

**1 верасня ў клубе «Графіці» а 19-й** — Apple Tea.

### Вольскі & Ко

**3 верасня тамсама а 19-й** — Лявон Вольскі & Ко.

### Сяргей Пукст

**10 верасня тамсама а 19-й** — творчы вечар Сяргея Пукста.

### Разбітае Сэрца Пацана

**Тамсама 12 верасня а 18-й** — «Разбітае Сэрца Пацана».

### Апошні герой

**3 верасня ў «Рэактары» (вул. Харужай, 29) а 19-й** — канцэрт-трыб'ют «Апошні герой» памяці В.Цоя і групы «Кіно».

### Брэтонская вечарына

**У «Лісінай нары» (вул. Каліноўскага, 32) 5 верасня** — «Брэтонская вечарына ад студыі «Глорыя» і гурта «Эйрут»»: традыцыйная брэтонская музыка і танцы.

## ВЫСТАВЫ

### Зямля пад белымі крыламі

**У Мастацкім музеі** працуе выстава «Зямля пад белымі крыламі», на якой можна ўбачыць працы звыш 300 аўтараў — народных мастакоў Беларусі, лаўрэатаў Дзяржаўнай прэміі, стыпендыятаў спецыяльнага фонду прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі. Выстаўляюцца і творы, набытыя музеем за апошнія дзесяць гадоў.

### Акварэль. Гарадскі пейзаж

**У Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр.Незалежнасці, 47) да 5 верасня** працуе выстава Ігара Сухарукава «Акварэль. Гарадскі пейзаж».

### Літага. Візуальныя даследаванні паэзіі

**У мінскім Інстытуце імя Гётэ (вул.В.Харужай, 25/3) з 8 да 30 верасня** працуе выстава «Літага. Візуальныя даследаванні паэзіі». Адкрыццё — **8 верасня а 19-й**. Беларускім мастакам былі прапанаваны тэксты сучасных нямецкамоўных паэтаў у арыгінале і ў перакладзе на беларускую мову. Выбраўшы адзін альбо некалькі тэкстаў, кожны ўдзельнік праекта паспрабаваў «даследаваць» яго, ужываючы сродкі выяўленчага мастацтва. Можна ўбачыць творы Руслана Вашкевіча, Міхаіла Гуліна, Сяргея Ждановіча, Сяргея Кірушчанкі, Аляксея Іванова, Аляксея Лунёва, Зоі Луцэвіч, Мікалая Батвінніка, Аляксандра Некрашэвіча, Вольгі Сазыкінай, Антаніны Слабодчыкавай і Сяргея Шабохіна.

### Карціна алеем

**У галерэі сучаснага мастацтва «Ў» (пр.Незалежнасці, 37а) да 19 верасня** працуе выстава «Карціна алеем». Гэта эксперымент, мэта якога — паглядзець, як сродкамі традыцыйных матэрыялаў могуць быць асэнсаваны творы, знаходзячыся на перадавым баку сучаснага мастацтва. Фатаграфія, відэа, інсталяцыя, арт–аб'екты і жывапіс алеем. Ці адбудзецца паміж імі дыялог? Наколькі яны далёкія адзін ад аднаго? Ці могуць яны ўзаемадзейнічаць адзін з адным?

### Гіганты Ледавіковага перыяду

**У Гістарычным музеі (вул.Маркса, 12) да 26 верасня** працуе выстава «Гіганты Ледавіковага перыяду» з фондаў Дзяржаўнага музея гісторыі Санкт–Пецярбурга «Петрапаўлаўская крэпасць». Мадэлі жывёл для выставы адноўлены па шкілетах даўніх вымерлых істот. Для гэтага выкарыстоўваліся сучасныя камп'ютарныя праграмы з трохмернай графікай. Экспанаты рухаюцца і рыкаюць! Гэта самая папулярная ў дзяцей выстава за апошні час.

## ТЭАТРЫ

**7 верасня**

**Тэатр оперы і балета** — «Набука»
**Расейскі тэатр** — «Пане Каханку»

**8 верасня**

**Расейскі тэатр** — «Эсфір»
**Тэатр оперы і балета** — «Набука»

**9 верасня**

**Тэатр імя Горкага** — «Злоўлены сеткай»
**Тэатр оперы і балета** — «Бахчысарайскі фантан»

**10 верасня**

**Тэатр оперы і балета** — «Бахчысарайскі фантан»
**Тэатр імя Горкага** — «Утаймаванне наравістай»

**12 верасня**

**Тэатр імя Горкага** — «Бег»

## КІНО

# Каты супраць сабак: Помста Кіці Гэлар

**Каты супраць сабак: Помста Кіці Гэлар** (Cats & Dogs: The Revenge of Kitty Galore)
ЗША — Аўстралія, 2010, каляровы, 82 хв.
**Рэжысёр:** Брэд Пэйтан
**Ролі выконваюць:** Джэймс Марсдэн, Нік Нолці, Крысціна Эплгейт, Кэт Уільямз
**Жанр:** анімалісцкая пародыя на шпіёнскія баевікі для ўсёй сям'і
**Адзнака:** 4,5 (з 10)




Кіці Гэлар, агентка шпіёнскай арганізацыі МЯУС, зусім азвярэла і збіраецца захапіць уладу над усім светам. Адстаўны паліцэйскі Дыгс атрымлівае заданне спыніць Кіці. Але для гэтага Дыгсу прыйдзецца супрацоўнічаць з былымі ворагамі…

Гучыць, як апісанне баевіка, але героі гэтага баевіка — сабакі і каты. Папярэдняя эпапея «Каты і сабакі» выстаўляла катоў ворагамі сабак і чалавецтва, што не прыйшлося даспадобы ўладальнікам катоў. У гэтым фільме няспраўядлівасць выпраўленая.

Фільм — камедыя для ўсёй сям'і.

**Андрэй Расінскі**

# Кубак СНД і галандцы

**Чэмпіён Беларусі трэці год запар трапіў у групавы этап футбольных еўракубкаў.**

Два гады БАТЭ гуляў у Лізе чэмпіёнаў, а летась і сёлета — у Лізе Еўропы.

Дарога да групы ляжала праз партугальскую выспу Мадэйра, дзе хлопцы Віктара Ганчарэнкі змагаліся з мясцовым «Марыціму». Узровень партугальскага футбола ў свеце вядомы добра, таму яшчэ нечаканей выглядаюць адносна лёгкія перамогі барысаўцаў у абодвух матчах — 3:0 і 2:1.

Вось што значыць міжнародны досвед папярэдніх гадоў. Найбольшы ўклад у перамогу ўнёс руды Аляксандр Паўлаў. Ён забіваў і ў Барысаве, і на Мадэйры, а яшчэ галявую перадачу аддаў.

Мела шанцы прабіцца ў групавы турнір і мінскае «Дынама», але не настроілася на матч з бельгійскім «Бругэ», таму і атрымала тры мячы яшчэ ў першым тайме. Магілёўскі «Дняпро» і так скокнуў вышэй галавы, калі прайшоў тры раўнды. Цягацца на роўных з іспанскім «Вільярэалам» камандзе яшчэ рана.

Лёс БАТЭ ў групе вызначаў найлепшы футбаліст сёлетняга чэмпіянату свету Дыега Фарлан. З яго лёгкай рукі мы трапілі ў адну кампанію з АЗ (Алкмар), «Дынама» (Кіеў), «Шэрыф» (Цірасполь).

### «Перамога пачынаецца ў Алкмары»

Каманда АЗ з галандскага горада Алкмар не мае доўгай гісторыі. Яна ўтварылася ўсяго толькі ў 1967 годзе шляхам зліцця клубаў «Алкмар-54» і «Занстрэк». Па першых літарах былых дружын і была ўтворана абрэвіятура.

Затое гарадок Алкмар (амаль удвая меншы за Барысаў), дзе базуецца клуб, мае багатую гісторыю. Ён знаходзіцца ў правінцыі Паўночная Галандыя. А першыя згадкі пра яго зафіксаваныя яшчэ ў X ст. Блізкае размяшчэнне да мора зрабіла паселішча буйным гандлёвым цэнтрам.

У 1573 годзе гэты горад вытрымаў іспанскую аблогу. А потым усё вызваленне краю ад іспанцаў пачалося з Алкмара. Ён быў першым горадам, што пазбавіўся ад іспанскага панавання. Ёсць нават нідэрландская прымаўка такая: «Перамога пачынаецца ў Алкмары».

Футбольны клуб АЗ гэтую ісціну пацвердзіў. Першыя поспехі прыйшлі да каманды пры канцы 1970-х. Яны звязаныя з імёнамі братоўбізнесменаў Кеса і Класа Моленараў. У 1978 годзе правінцыйная каманда ўпершыню выйграе Кубак Нідэрландаў, а праз тры гады становіцца чэмпіёнам краіны. У той самы сезон клуб дайшоў фіналу Кубка УЕФА, дзе саступіў англійскаму «Іпсвічу». Гэта быў зорны час АЗ.

Дарэчы, камандзе належыць цікавае дасягненне. На працягу трыццаці гадоў (1977—2007) АЗ не прайграваў у еўракубках на сваім стадыёне. Толькі ліверпульскаму «Эвертану» ўдалося пабіць гэты рэкорд.

Але пасля сыходу спрытных братоў АЗ пачаў хілець — каманда нават вылецела з эліты. Другі перыяд адраджэння прыпаў ужо на 2000-я. Спачатку клуб дайшоў да паўфіналу ўсё таго ж Кубка УЕФА. А летась АЗ у другі раз стаў чэмпіёнам Нідэрландаў. У апошнім жа першынстве Алкмар быў толькі пятым.

### Каманда Валерыя Лабаноўскага

Залішняя прадстаўленні кіеўскаму «Дынама» не патрэбныя. Балельшчыкі са стажам лёгка могуць узгадаць мноства прынцыповых паядынкаў паміж мінскімі і кіеўскімі аднаклубнікамі.

«Дынама» ўтварылася ў 1927 годзе, яшчэ да галадамору. Ініцыятарам быў начальнік кіеўскага акруговага аддзела ГПУ Сямён Западны. У 1936 годзе кіеўцы былі ўдзельнікамі першага чэмпіянату СССР па футболе, дзе занялі другое месца, услед за «Дынама» (Масква). Дарэчы, толькі дзве гэтыя каманды ўдзельнічалі абсалютна ва ўсіх першынствах Савецкага Саюза.

Падчас Другой сусветнай многія «дынамаўцы» сталі працоўнымі хлебазавода №1. Ім часта даводзілася сустракацца з немецкімі аматарамі. Кіеўцы перамагалі. Пасля вайны гэтыя матчы абрасталі міфамі. Пра іх пісалі кнігі і здымалі фільмы. Усе футбалісты, што ў іх удзельнічалі, атрымалі медалі «За адвагу».

У 1961 годзе «Дынама» ўпершыню стала чэмпіёнам СССР, апярэдзіўшы «Спартак» (Масква). Агулам першынства Саюза «Дынама» выйгравала трынаццаць разоў.

Але найбольшых поспехаў клуб дасягнуў пры трэнеры Валерыю Лабаноўскім. У 1975 годзе каманда выйграе Кубак кубкаў, а Алег Блахін становіцца найлепшым футбалістам Еўропы. Пазней такога самага поспеху дасягнуў Ігар Бяланаў.

Лабаноўскі быў адэптам прагматычнага футбола. Яго ідэалагічны візаві з'явіўся ў Мінску. Эдуард Малафееў прапанаваў сваім футбалістам гуляць у «шчыры футбол». Не па пэўнай расстаноўцы і тактыцы, а сэрцам. Яны супернічалі шмат гадоў, у тым ліку ў зборнай СССР. Усё ж поспехаў у Лабаноўскага было непараўнальна больш, чым у рамантыка Малафеева. Па смерці Лабаноўскага ягоным імем быў названы стадыён, дзе цяпер гуляе «Дынама».

Па развале СССР «Дынама», натуральна, стала флагманам украінскага футбола. Толькі апошнія гады барацьбу навязаў данецкі «Шахтар».

За «Дынама» гуляла і багата беларусаў: Валянцін Бялькевіч, Аляксандр Хацкевіч, браты Макоўскія, Сяргей Карніленка, Андрэй Варанкоў.

### Імперыя Віктара Гушана

Цірасполські «Шэрыф» мае найкарацейшую гісторыю з супернікаў БАТЭ. Ён заснаваны ўсяго толькі ў 1996 годзе.

Ужо праз пяць гадоў каманда стала чэмпіёнам Малдовы. Пасля гэтага ніводзін іншы клуб так і не змог скінуць цірасопальцаў з першага радка. «Шэрыф» выйграваў першынство дзесяць разоў запар.

Вялікую ролю ў гэтым адыграў беларускі спецыяліст Леанід Кучук, які на працягу многіх гадоў узначальваў клуб. За клуб гуляў і ягоны сын Аляксей, які двойчы станавіўся найлепшым бамбардзірам малдаўскага чэмпіянату.

Толькі летась пасля канфлікту з кіраўніцтвам Кучук быў вымушаны пакінуць клуб. А ягонае месца заняў... зноў беларус Андрэй Сасніцкі. Следам за поспехамі на ўнутранай арэне прыйшлі і міжнародныя. У групе Лігі Еўропы «Шэрыф» гуляе другі год запар.

Футбольны клуб — гэта толькі частка вялікага холдынга «Шэрыф», які належыць былому вайскоўцу Віктару Гушану і размяшчаецца ў Прыднястроўі. Таксама «Шэрыф» — гэта запраўкі, супермаркеты, тэлебачанне, мабільная сувязь, выдавецтвы, рэкламныя агенцтвы, віны і хлебазаводы. Усяго ў холдынгу працуе больш за 10 тысяч чалавек.

Часам кажуць, што гэта «Шэрыф» кіруе Прыднястроўем.

**Зміцер Панкавец**

**Расклад гульняў**

**16 верасня.** «Дынама» (Кіеў) — БАТЭ
**2 снежня.** БАТЭ — «Дынама» (Кіеў)
**30 верасня.** БАТЭ — АЗ
**16 снежня.** АЗ — БАТЭ
**4 лістапада.** БАТЭ — «Шэрыф»
**16 лістапада.** «Шэрыф» — БАТЭ

НАЛЯТАЙ!

# Грэцкая паніка

**У мінскіх крамах, услед за расійскімі, падаражала грэчка.**

Афіцыйныя асобы Расіі адрапарталі, што так званы «дэфіцыт грэчкі» справакавалі СМІ, якія спекулююць на тэме сушы. Прадстаўнікі Расійскага зернявага саюза супакоілі, што ўраджай грэчкі сёлета будзе дастатковым для задавальнення патрэбаў унутранага рынку. Аднак Расія спыніла экспарт збожжа. А Беларусь грэчку закупляла найбольш у Башкірыі.

У выніку рэха «грэцкай панікі» дакацілася і да Беларусі. Што праўда, закранула яно пакуль толькі сталіцу. У крамках грэчку размялі. У іншых цэны ўзляцелі з 2500 рублёў да 4000. «Бярыце, пакуль не падаражала!» — смяецца прадавачка ў адной з крамаў на галоўным праспекце.

На Камароўскім рынку амаль ва ўсіх прадаўцоў грэчка расійскага паходжання з выявай генералісімуса Суворава каштуе ад 4100 рублёў. Пры жаданні на Камароўцы аматару грэчкі можна яшчэ знайсці беларускую па 1650 рублёў за 750-грамовы пакунак.

Дырэктар Гомельскага камбіната хлебапрадуктаў Міхаіл Белашыцкі раіць не спяшацца: «Беларусы свой грэчкі яшчэ не сабралі». Ён адзначыў, што закупныя цэны на грэчку засталіся ранейшымі, а прагнозы на ўраджай неблагія.

**Сямён Печанко**



СЯМЁН ПЕЧАНКО

## Сапраўдная беларуская кухня

### Гусь з макаронай

1 гусь, соль, перац, 200 г макароны, 1 лыжка масла, 1 жаўток, 1 яйка, трохі мускатнага цвету, 100 г сала, 1 пятрушка, 1—2 морквы, 1 парэй, 1 цыбуля.

На соус: 1—2 шклянкі булёну, 0,5 лыжкі масла, 1 лыжка каперсаў або алівак, 1 лыжка мукі.

Падрыхтаваную і пасоленую гусь разрэзаць па хрыбце, выняць акуратна косці, пакінуўшы іх толькі ў сцёгнах і крылцах, папярчыць і нафаршаваць так: зварыць 200 ці больш грамаў макароны (гледзячы па велічыні гусі), падрумяніць добрую лыжку масла, перамяшаць макарону з маслам, дадаць жаўток і цэлае яйка, усыпаць трохі ўтоўчанага мускатнага цвету, перамяшаць, нафаршаваць гусь і пячы ў гусятніцы, спод якой выкласці салам і карэннем (а таксама пакласці сала і карэнне на гусь зверху), часта пераварочваць, каб птушка прапяклася раўнамерна.

Соус зрабіць з моцнага булёну з каперсамі або алівкамі, а вадкасці, якая выцекла з гусі, узяць толькі частку, прычым без тлушчу.

Гэтым спосабам можна прыгатаваць і качкі, калі яны вялікія і мясістыя.

Каб было смачней, можна пакласці ў макарону нарэзаную кавалачкамі шынку або язык.

**З кнігі Вінцэнты Завадскай «Літоўская кухарка», 1854**
**Падрыхтавала НБ**

## Прыватныя абвесткі

**ВІТАННІ**

**Віншуем Лявона Баршчэўскага з нараджэннем унучкі,** а ўсю ягоную сям'ю — з папаўненнем роду. Хай расце здаровая, разумная, шчаслівая. Хай не знае гора, хай усё ёй пад ногі сцелецца. Сябры.

**ПАДАРОЖЖА**

**Запрашаем** у сяброўскае падарожжа 12 верасня па маршруце: Мінск—Мікелеўшчына—Правыя Масты—Белавічы—Струбніца—Пескі—Самуйлавічы Дольныя—Вялікая Рагозніца—Краманіца—Мінск. Т.: 262–73–43, (029) 111–73–32.

**ПОШУК**

**Шукаю жыхара Малмыг,** народжанага ў 1933 г. Капцюга Гаўрылу Еўдакімавіча. Звесткі ў рэдакцыі.

**ПРАЦА**

**Шукаю выкладчыка матэматыкі** для заняткаў з вучнямі 8–9 класаў. Т.: (029) 774–22–47.

**КВАТЭРА**

**Беларускамоўная пара здыме** кватэру ў Мінску. Тэл. 287–33–57 (МТС), 703–88–18 (Vel).

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## Кемікі



1) Галя жыве на трэцім паверсе дома, а Тома ў тым жа доме, але падымаецца па лесвіцы ўдвая вышэй, чым Галя. На якім паверсе жыве Тома?

2) Кошык бульбы важыць на 10 кг больш, чым палова яго. Колькі важыць бульба ў кошыку?

3) На агародзе сабрана 8 гарбузоў вагой 1 кг, 2 кг, 3 кг, 4 кг, 5 кг, 6 кг, 7 кг, 8 кг. Дачніца з сабою мае 4 мяшкі. Як раскласці гарбузы, каб вага кожнай ношы была аднолькавай?

**Сабрала Валянціна Карнялюк.**

**Адказы глядзі на старонцы 16.**




**Нягледзячы на рост заробкаў, узровень жыцця ў Беларусі застаецца адным з найніжэйшых у Еўропе. У 2010 годзе па заробках нашу краіну абагнала Албанія. Там сярэдні заробак па стане на 1 ліпеня складаў 375 еўра, ці 470 даляраў. На фота: Затое ў Мінску бегае ўсё больш «Лімузінаў».**



**На Рэспубліканскім экалагічным конкурсе Слонімскі водаканал прэзентавала такая сімпатычная кропелька.**



**П'яны згоншчык пратараніў на МАЗе дом у вёсцы Гінавічы (Гродзеншчына). Людзі ў доме не пацярпелі.**




# Беларускі трансфер года: Аляксандр Глеб перайшоў у «Бірмінгем»

Самы таленавіты беларускі футбаліст зноў перабіраецца на Туманны Альбіён. Аляксандр Глеб аддадзены ў гадавую арэнду клубу Прэм'ер-лігі «Бірмінгем Сіці». Здавалася б, эпапея з пераходам Глеба не скончыцца ніколі. Яшчэ ўвесну беларус пакінуў стан нямецкага «Штутгарта», пасля чаго вярнуўся ў іспанскую «Барселону», якой належыць па кантракце.

Трэнер каталонцаў Хасэ Гвардыёла ўсяляк даваў зразумець, што не хоча бачыць Глеба ў складзе сваёй дружыны. Яго не ўключалі нават у заяўкі таварыскіх матчаў. Тым не менш, агент футбаліста працягваў сцвярджаць, што месца Аляксандру толькі ў славутай «Барселоне».

Паведамленні пра новы кантракт Глеба з'яўляліся штотыдзень. Куды яго толькі не сваталі — «Астан Віла», «Фулхэм», «Ліверпуль», «Тотэнхэм», «Мілан», «Баварыя», «Інтэр», «Севілья», «Бешыкташ».

У апошні момант усплыў варыянт з партугальскай «Бенфікай». Расійская і Англійская Вікіпедыі нават ужо паспелі напісаць, што беларус перайшоў у гэты клуб.

У той самы дзень выплыла інфармацыя, што Саша ў «Бірмінгеме». Позна ўвечары былі ўзгодненыя дэталі кантракта.

«Бірмінгем» — гэта не гранд англійскага футбола. Каманда ні разу не была чэмпіёнам краіны. Толькі аднойчы яны выйгравалі Кубак Лігі.

Пасля вайны ў Бірмінгеме быў утвораны беларускі эміграцыйны асяродак. Нават дзейнічаў прыход Жыровіцкай Божай Маці.

Пасля трох тураў чэмпіянату Англіі «Бірмінгем» займае шостае месца, маючы пяць пунктаў. Летась каманда заняла дзявятую пазіцыю.

«Бірмінгем» — гэта пяты клуб у кар'еры Глеба. Раней ён выступаў за БАТЭ, «Штутгарт», «Арсенал» (Лондан), «Барселону».

**Зміцер Панкавец**

## Анекдоты

— Дзяўчынка! А ты не баішся так позна адна вяртацца дадому?
— Яшчэ як баюся! Раптам хто-небудзь спыніць, а я сёння без пашпарта і нават без дазволу на зброю!

* * *

Калі кітайцы б'юцца раён на раён — бойку відаць з космасу.

* * *

Народная прыкмета: чым горш выглядае курортнік, які вярнуўся дадому, тым лепш ён адпачыў.

* * *

Папарацы ўдалося сфатаграфаваць Пэрыс Хілтан адзетай.

* * *

Дарагія калегі-дзяўчаты! Калі вы будзеце працягваць прыходзіць на працоўныя нарады ў кароткіх спадніцах або з глыбокім дэкальтэ, мужчыны будуць прыносіць на нарады свечкі і шампанскае!

## «НН» сто гадоў з вамі

**Іванец мае сваю славу — заслужоную славу.** Выробляюць тут кафлі да печы і розную гліняную пасудзіну. Усе гэтыя вырабы вельмі аздобныя. Але мы, калі і маем што добрае, то не ўмеем з гэтага выкарыстаць. Іванецкім фабрыкантам трэба было б канечне мець па мястэчках і гарадах свае хаўрусныя склады ўсялякіх вырабаў. Толькі такім парадкам можна было б павялічыць продаж.

**«НН». №35. 1910.**

**Аляксандр Лукашэнка паабяцаў за паўгода давесці сярэдні заробак у краіне да 100 даляраў.** Гэта значыць, што курс даляра мяркуюць трымаць на адным узроўні, а цэны і заробкі — адпусціць. Сумнеўны эканамічны эксперымент. Мабыць, у рамках гэтай палітыкі зноў на 15% падаражэлі паслугі тэлефоннай сувязі і, у які ўжо раз, — бензін.

**«НН». № 35. 2000.**

**Адказы да старонкі 15:**
1) На пятым.
2) 20 кг.
3) 1+8, 3+6, 2+7, 4+5.



**У Лагойску прайшоў Міжнародны фестываль феерверкаў «Навальніца-2010».**




**«Ляпіс Трубяцкой» сыграў на міжнародным рок-фэсце «Шыгет» у Венгрыі. На фота: падчас выканання «Belarus Freedom».**

**Наша Ніва**
незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Генадзевіч Скурко
заснавальнік — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА.** Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15–128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

**Наклад 6410.** **Газета выдаецца 48 разоў на год.**
Нумар падпісаны ў друк 23.00 31.08.2010.
Замова № 4241.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15–128.
ISSN 1819-1614
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
9 771819 161008 10033